ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 27 (998) 2 ліпеня 2011 г. Кошт 1500 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Традыцыйна трэцяга ліпеня мы аддаём даніну павагі доблесці і гераізму франтавікоў і працаўнікоў тылу, партызанаў і падпольшчыкаў, якія прынеслі свабоду беларускаму народу. Шануем бяспрыкладны подзвіг савецкага салдата, смуткуем аб мільёнах загінулых дзеля Вялікай Перамогі. Вечная ім слава!

Спадчыннікі пераможцаў з пачуццём глыбокай адказнасці за лёс Радзімы працягваюць традыцыі старэйшых пакаленняў па захаванні і прымнажэнні іх заваёў, забеспячэнні міру і бяспекі, умацаванні суверэнітэту беларускай дзяржавы.

За мінулыя дзесяцігоддзі адроджаная стваральнай працай народа незалежная Беларусь заняла годнае месца ў сусветнай супольнасці.

Упэўнены, што дзякуючы згуртаванасці і працалюбству мы справімся з любымі перашкодамі на шляху да вызначанай мэты — далейшага росквіту роднай Беларусі.

У гэты святочны дзень ад усёй душы жадаю вам нязменнай любові да Бацькаўшчыны, упэўненасці ва ўласных сілах і цудоўнай будучыні нашай краіны.

Добрага вам здароўя, міру і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь
Аляксандр ЛУКАШЭНКА
3 ліпеня 2011 года

ВЕЧНА ЖЫВІ І КВІТНЕЙ, БЕЛАРУСЬ!

3 ЛІПЕНЯ — ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (ДЗЕНЬ РЭСПУБЛІКІ)

“Вам пад сілу любыя вышыні...”

Штогадовы традыцыйны Рэспубліканскі баль выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў, які адбыўся ў мінулы аўторак у Палацы Рэспублікі, чарговы раз сабраў у цэнтры беларускай сталіцы лепшых з тых, хто, пакінуўшы студэнцкія аўдыторыі, літаральна праз месяц з невялікім пачне свой працоўны шлях. І пачнецца ён на высокай ноце, падкрэсліў у сваім звароце да выпускнікоў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка, зазначыўшы, што беларускія дыпломы каціруюцца ва ўсім свеце, а папулярнасць нашых ВНУ за мяжой расце год ад года.

Адзначаючы, што ў гэтыя хвіліны маладыя людзі стаяць перад адным з самых важных этапаў — жыццёвым выбарам далейшага шляху, — Лідар краіны падкрэсліў: “Лепш з першых крокаў будаваць свой лёс так, каб потым ніколі не пашкадаваць ні аб адным марна пражытым дні. А калі вы спытаеце, што неабходна чалавеку, каб дабіцца поспеху, я адказаў бы: для гэтага абавязкова трэба мець мару, якая акрыляе”. І дадаў: “У кожнага з нас — свае жаданні. Але, думаю, усіх нас аб’ядноўвае адна вялікая агульная мара: зрабіць нашу краіну ўтульным, квітнеючым домам для кожнай сям’і. Галоўныя мэты і шырокія гарызонты, да якіх трэба імкнуцца, яшчэ наперадзе. Сучаснай Беларусі крыху больш як 20 гадоў — гэта ўзрост кіпучых сіл і надзей”.

Звяртаючыся да выпускнікоў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: “Менавіта цяпер наша краіна мае патрэбу ў такіх людзях, як вы, — разумных, энергічных, мэтанакіраваных. Вам пад сілу любыя вышыні, бо вы атрымалі выдатную адукацыю на роднай зямлі”. Але, разам з тым, Кіраўнік дзяржавы перасцярог маладых людзей, папрасіўшы “як дарослых, паспяховых людзей не паддавацца ні на якія правакацыі і авантуры, — а спакусы ў жыцці будзе дастаткова, — быць сапраўднымі патрыётамі, сумленнымі і адказнымі грамадзянамі сваёй краіны”.

Беларускі Лідар падзякаваў кіраўнікам айчынных ВНУ і выкладчыкам за высокі ўзровень падрыхтоўкі маладых спецыялістаў. А дзесяці лепшым выпускнікам, якія праявілі выдатныя поспехі ў навучанні, прыкладныя паводзіны і прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, Аляксандр Лукашэнка ўручыў Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Разам з Лідарам краіны свае словы ў далейшае жыццё “адрасаваў” выпускнікам і класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч, 120-годдзе з дня нараджэння якога адзначаецца сёлета: у выкананні акцёра Купалаўскага тэатра Ігара Пятрова, ён пажадаў кожнаму з тых, хто сабраўся ў гэты дзень у Палацы Рэспублікі, знайсці сваю Зорку шчасця, якая і будзе асвячаць далейшае жыццё і стане Зоркай пуцяводнай. Народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук прачытаў выпускнікам, бадай, адзін з самых вядомых вершаў класіка “Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...”, а Нацыянальны акадэмічны аркестр народных інструментаў імя І.Жыновіча пад кіраўніцтвам Міхаіла Казінца выканаў ягоную, не менш знакамітую, “Зорку Венеру”.

І, канешне ж, урачыстая атмасфера балю прадоўжылася прыёмам у гонар выпускнікоў, сапраўднымі бальнымі турамі і — завязваннем лісточкаў-мар на сімвалічным Дрэве здзяйснення жаданняў.

Таццяна КОМАНАВА
Фота Мікалая ПЯТРОВА, БелТА

Канструкцыя канструктыўнасці

А літаральна напярэдадні бальных урачыстасцей у Нацыянальным мастацкім музеі міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка сустрэўся з лепшымі выпускнікамі творчых ВНУ краіны.

У шчырай размове з выпускнікамі, якія літаральна “засыпалі” міністра культуры пытаннямі пра будучае — уласнае і нацыянальнай культуры, — Павел Паўлавіч не стаў будаваць “паветраных замкаў”, а прапанаваў маладым паглядзець на сітуацыю канструктыўным чынам, засяродзіцца на тым, што кожны на сваім месцы можа даць краіне, народу, сваёй прафесіі, а не чакаць, пакуль дзяржава створыць “цяплічныя” ўмовы для таго, каб атрымаць усё “на талерачцы”. Сённяшняя дзяржаўная палітыка ў галіне культуры, як, зрэшты, і ў іншых сферах грамадскага жыцця, скіравана, у першую чаргу, на актывізацыю творчай ініцыятывы, пошукі новых, сучасных механізмаў творчай самарэалізацыі. “Безумоўна, — зазначыў ён, — дзяржава будзе падтрымліваць цікавыя творчыя праекты. Але падтрымліваць — не значыць фінансаваць на сто працэнтаў”.

Фота Пятра ОВАДА

Прывітаўшы прысутных багдановічаўскімі ж радкамі: “Маладыя гады — маладыя жаданні...”, ён зазначыў, што заканчэнне ВНУ — гэта, на самой справе, толькі пачатак таго далейшага творчага шляху, які кожны абраў для сябе. І галоўнае на ім — заставацца верным сваёй мэце, не збочваючы і не ідучы на кампрамісы ў справе служэння сваёй прафесіі і сваёй Радзіме, народу.

Аб тых новых спрыяльных умовах, якія сёння складваюцца ў галіне, Павел Латушка распавёў, у прыватнасці, адказваючы на пытанне аб перспектывах стварэння ў нашай краіне маладзёжнага фестывалю. Ён зазначыў, што тыя падатковыя льготы, якія з 1 ліпеня будуць дзейнічаць у галіне кінавытворчасці, даюць падставы разлічваць на тое, што ініцыятыва ў гэтай сферы стане больш актыўнай. А яна плюс пошук спонсараў, зацікаўленых у сумеснай працы ў дадзенай галіне, здольныя даць у рукі козыры ўсім тым, хто на самой справе зацікаўлены ў развіцці айчыннага кіно.

Ад імя кіраўнікоў творчых ВНУ выпускнікоў прывітаў рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Барыс Святлоў. Ён пажадаў былым студэнтам не развітвацца са сваімі alma mater, бо ўсе яны былі і застаюцца “дзецьмі”, што могуць кожную хвіліну звярнуцца да сваіх “бацькоў”-выкладчыкаў па дапамогу. А народны артыст Беларусі Віктар Манаеў пажадаў прысутным галоўнага, на яго погляд: баяцца і пазбягаць цынізму ў любых яго праявах і трымаць уласныя сэрцы незамутненымі, каб тое святло духоўнасці, якім кожнаму творцу наканавана дзяліцца з іншымі, заўсёды магло прабіцца да людзей.

Т.К.

Акорды парада і Гімна

Галоўнымі канцэртнымі пляцоўкамі сталіцы ў Дзень Незалежнасці стануць парк Перамогі і тэрыторыя ля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

На апошняй свята будзе мець нетрадыцыйнае напаўненне, як падкрэсліла начальнік упраўлення культуры Мінскага гарвыканкама Віталіна Рудзікава. Першы блок канцэрта прадставіць дзіцячыя калектывы з рэгіёнаў краіны, а другім блокам стане выступленне Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору імя Г.Цітовіча.

Па словах ваеннага каменданта Ваеннай камендатуры Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь Анатоля Грыцава, парад у гонар Дня Незалежнасці краіны будзе складацца з трох блокаў: пешага строю, праезду баявой тэхнікі і пралёту баявой авіяцыі. А ў заключнай яго частцы будуць ісці зводная рота ганаровай варты і ваенны аркестр.

Ля стэлы “Мінск — горад-герой” спяём Гімн разам!

У час руху калоны баявой тэхнікі да месца рэпетыцыі парада.

Канцэрт “Свет віншуе Беларусь” збярэ заўтра вечарам папулярных беларускіх і замежных артыстаў ля стэлы “Мінск — горад-герой”. Сярод выканаўцаў — удзельнікі конкурсу “Еўрабачанне” з Малдовы і Эстоніі, пераможца аднаго з мінулых творчых спаборніцтваў — спявачка Руслана. Па традыцыі, пасля гала-канцэрта запланавана акцыя “Спяём Гімн разам!”, а таксама феерверк з незвычайнымі эфектамі, якіх раней жыхары сталіцы не бачылі. Для яго правядзення закуплены новыя тыпы феерверачных вырабаў.

Кадравыя рашэнні

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка 30 чэрвеня разгледзеў кадравыя пытанні.

Як паведаміла Прэс-служба Кіраўніка дзяржавы, Прэзідэнт даў згоду на прызначэнне Алега Сільвановіча генеральным дырэктарам Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства “Нацыянальная кінастудыя “Беларусьфільм”.

Увага! Аб’ява*

Установа адукацыі
“Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”

аб’яўляе набор у 2011 г.

у АСПІРАНТУРУ з адрывам і без адрыву ад вытворчасці па спецыяльнасцях:
17.00.01 — тэатральнае мастацтва; 17.00.03 — кіна-, тэле- і іншыя экранныя мастацтвы; 17.00.04 — выяўленчае, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура; 17.00.06 — тэхнічная эстэтыка і дызайн;

Прэтэндэнты падаюць наступныя дакументы:
— асабовы лісток па ўліку кадраў, аўтабіяграфію і два фотаздымкі памерам 4х6 см;
— спіс і копіі апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў, патэнтаў (пасведчанняў на прамысловы ўзор);
— асобы, якія не маюць апублікаваных навуковых прац, вынаходніцтваў, патэнтаў (пасведчанняў на прамысловы ўзор), прадстаўляюць навуковыя даклады, рэфераты (20 — 40 друк. старонак) па абранай тэме ў адпаведнасці са спецыяльнасцю;
— медыцынскую даведку (форма 086У);
— выпіску з пратакола пасяджэння савета вышэйшай навучальнай установы (факультэта) для асоб, якія рэкамендаваны ў аспірантуру непасрэдна пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы;
— рэкамендацыю з месца працы (для асоб, якія маюць вопыт практычнай работы);
— копіі дыплома аб вышэйшай адукацыі і выпіскі з заліковай ведамасці;
— копію (выпіску) з працоўнай кніжкі;
— копіі дакументаў аб здачы кандыдацкіх экзаменаў (пры наяўнасці ў паступаючых у аспірантуру здадзеных кандыдацкіх экзаменаў);
— копію дакумента аб прысуджэнні вучонай ступені кандыдата навук (для паступаючых у дактарантуру).
Пашпарт, дыплом аб заканчэнні вышэйшай навучальнай установы, дакументы аб здачы кандыдацкіх экзаменаў, дыплом кандыдата навук (для паступаючых у дактарантуру) прад’яўляюцца асабіста.
На 2011 год вызначаны наступныя тэрміны прыёму: прыём дакументаў — з 15 па 30 верасня; уступныя экзамены — з 14 кастрычніка па 14 лістапада; залічэнне — 1 снежня.
Адрас Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў: 220012, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 81, каб. 310.
Тэлефоны: 292-76-43, 292-81-51 (для замежных грамадзян).

СУВЕРЭНІТЭТ, ТВОРЦА, ПЕРСПЕКТЫВЫ

"Круглы стол" "К"

Незалежная Бацькаўшчына: тэндэнцыі за дваццаць гадоў, праекты на наступныя дваццаць

24 чэрвеня ў Інфармацыйным цэнтры "Культура-інфа" прайшоў "круглы стол", прымеркаваны да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Нашай суверэннай краіне — 20 гадоў. Кожны з іх — як прыступка ў няўхільным руху наперад. За кожным з іх — штодзённыя намаганні кожнага з нас, у тым ліку — работнікаў культуры і мастацтва, па ўмацаванні таго, што прынята называць духоўнасцю.

Менавіта 20-гадовы шлях культуры дзяржавы стаў тэмай гутаркі за чарговым рэдакцыйным "круглым сталом". У яго рабоце прынялі ўдзел першы намеснік начальніка ўпраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Ігар КУЗНЯЦОЎ, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір ПРАКАПЦОЎ, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Вольга ДАДЗІЁМАВА, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, кампазітар, дацэнт БДАМ, старшыня Мінскага гарадскога аб'яднання Беларускага саюза музычных дзеячаў Віктар ВОЙЦІК, дырэктар Мастацкай галерэі "Універсітэт культуры" Дзяніс БАРСУКОЎ, дырэктар Дабрачыннага фонду "Любчанскі замак" Іван ПЯЧЫНСКІ, намеснік дырэктара па маркетынгу РВУ "Культура і мастацтва", кіраўнік Інфармацыйнага цэнтра "Культура-інфа" Антон СІДАРЭНКА, рэдактары аддзелаў газеты "Культура" Яўген РАГІН і Ілья СВІРЫН.

Антон СІДАРЭНКА:

— Мы сабраліся, каб пагутарыць аб тым культурным плёне, што далі гады незалежнасці Беларусі асабіста вам і вашай сферы дзейнасці. Кожны назапасіў немалы вопыт работы, даўно займеў свой уласны пункт гледжання на працэс шматграннага развіцця нацыянальнай культуры, нацыянальнага мастацтва...

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Дазвольце пачаць мне. Па сутнасці, з гадамі незалежнасці і звязана мая праца ў культуры. З 1990-га працаваў у дзіцячай школе мастацтваў, з 1992-га — яе дырэктарам, потым кіраваў аддзелам культуры ў Горацкім райвыканкаме, быў спецыялістам Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра, начальнікам аддзела культуры Бабруйскага гарвыканкама, генеральным дырэктарам Магілёўскага абласнога кінапраката, цяпер працую ва ўпраўленні культуры Магілёўскага аблвыканкама… Зрухі за гэты час адбыліся ў нашай сферы неймаверныя. Але самыя істотныя бяруць адлік з 1994 года, калі наша рэспубліка стала прэзідэнцкай.

Яўген РАГІН:

— Пра гэта сёння і гаворка... Што, на ваш погляд, найперш актывізавала якасна, знакава нашу рэгіянальную культуру?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Дзяржпраграма адраджэння і развіцця сяла. Узнікла больш за дзве сотні аграгарадкоў са стабільным і эфектыўным сацыякультурным забеспячэннем насельніцтва. Будынкі ўстаноў культуры, іх абсталяванне, кадры адпавядаюць самым сучасным патрабаванням. Цяпер — новыя тэхналогіі, новае будаўніцтва, новыя тыпы ўстаноў культуры… Ведаеце, калі гутарыш з расійскімі ці ўкраінскімі калегамі, пераконваешся, што такой дзяржпадтрымкі, як у нас, культура там не адчувае. Возьмем транспарт, без якога губляем такую істотную перавагу, як мабільнасць. На Магілёўшчыне на гэта працуе больш за 50 транспартных адзінак.

Ілья СВІРЫН:

— Вы згадвалі кадры. А немалаважным фактарам у іх замацаванні з'яўляецца забеспячэнне жыллём…

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Менавіта так. Каля 15 службовых кватэр штогод выдаткоўваем для работнікаў культуры. Гэта, таксама, я лічу, вынік незалежнай унутранай палітыкі дзяржавы, а таксама — трывалая грамадзянская пазіцыя губернатара Магілёўскай вобласці. І гэта — сацыяльная заваёва. Кватэра ў абласным, раённым цэнтры ці катэдж на сяле — ці ж гэта не стымул для далейшага творчага развіцця работніка?

Яўген РАГІН:

— А як змянілася апошнім часам свядомасць гэтага работніка?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Лічу, самым карэнным чынам. Мільярдныя ўкладанні ў матэрыяльную базу не могуць не паўплываць і на ступень нашай адказнасці ў стаўленні да справы. Людзі пачалі думаць інакш, больш ініцыятывы з'явілася… Якасна іншымі сталі нашы самадзейныя калектывы, сярод якіх шмат заслужаных…

Яўген РАГІН:

— У савецкі час такое званне існавала?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Не, былі толькі народныя ансамблі. Званне "заслужаны аматарскі" з'явілася пасля знікнення Савецкага Саюза і істотна падштурхнула самадзейных артыстаў да імклівага творчага росту. Вы ведаеце, што на мясцовым узроўні цяпер існуе магчымасць дадатковага фінансавання такіх структур, павелічэння бюджэтных ставак… Словам, асноўным дасягненнем беларускай незалежнасці лічу тое, што разам з рэспублікай няўхільна крочыць наперад і наша культура. І мы пастаянна ўмацоўваем пазіцыі, нягледзячы на ўсе сённяшнія эканамічныя складанасці.

Яўген РАГІН:

— Якія ж дасягненні ў прафесійнага мастацтва Магілёўшчыны? Да прыкладу, у 2000-м годдзе быў адрамантаваны абласны драмтэатр...

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— На рубяжы мінулага і бягучага гадоў абласны цэнтр займеў і новы будынак Тэатра лялек. Дзяржава выкарыстала на гэта каля 15 мільярдаў рублёў. Пагадзіцеся, таксама важкі вынік. Толькі светлавой і гукаўзмацняльнай апаратуры тут на два з паловай мільярды. Натуральна, трупа, заўжды моцная і цікавая, на сёння стала яшчэ больш запатрабаванай. Таму з'явіліся і вячэрнія спектаклі. Больш стала гастролей: да тэатра сталі ставіцца з падвоенай, я сказаў бы, увагай, пачалі больш запрашаць да сябе, таму замежны і айчынны гастрольныя графікі вельмі шчыльныя.

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Добра вядомыя вашы пленэры…

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Так, і гэта таксама здабытак незалежнасці. Пленэры на базе Мастацкага музея імя Паўла Масленікава (мастакі з 20 краін свету цяпер у ім удзельнічаюць), а таксама ганчарскі "Арт-Жыжаль" у Бабруйску. Дарэчы, менавіта ў гэтым горадзе мы плануем адрамантаваць Мастацкі музей Георгія Паплаўскага і стварыць там спрыяльныя ўмовы для працы карціннай галерэі. Акадэмік гатовы перадаць свае творы…

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Мы знітаваны з Магілёўшчынай шчыльнымі стасункамі. Наша галерэя сябруе з Валерыем Калтыгіным, з ягоным сынам Максімам, і вырабы па выніках "Арт-Жыжаля" выстаўляюцца і ў нас… На Беларусі захавалася ўнікальная школа керамістаў, якой у Еўропе ўжо не існуе.

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— І не забывайце, што ўсё гэта адбываецца пры самай дзейснай падтрымцы нашай дзяржавы. І гастролі, і пленэры ладзяцца за бюджэтны кошт.

Антон СІДАРЭНКА:

— А якая падзея апошніх гадоў сталася для вас найбольш эмацыйнай, а таму запомнілася?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Калі працаваў у Горацкім раёне і прыязджаў на сяло, заўжды радаваўся плёну працы тамтэйшых работнікаў культуры, іх надзвычайнаму стаўленню да выканання сваіх абавязкаў. Нагод для такой радасці хапае, безумоўна, і цяпер… Ніхто цяпер не скажа, што на сяле ў работнікаў клубных устаноў нізкія заробкі. Таму і аддача — адпаведная. Людзі бачаць увагу дзяржавы, гэта, як мы ўжо згадвалі, і змяняе свядомасць карэнным чынам.

Яўген РАГІН:

— Рэгіянальная культура — гэта і захаванне аўтэнтыкі. Што трэба зрабіць, каб захаваць той жа фальклор, які сапраўды стаў нашым нацыянальным набыткам, што якасна адрознівае Беларусь ад іншых краін свету, і гарантам, не пабаюся пафаснасці, нашай далейшай, так бы мовіць, духоўнай незалежнасці?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Ёсць такое паняцце — "экалогія культуры". Дык вось, ніякім ціскам на названую сферу ўплываць немагчыма — яе трэба ахоўваць. Ахоўваць дзеля захоўвання. Так, носьбіты сыходзяць, гэта працэс непазбежны. Наша задача — фіксацыя, падтрымка, не столькі матэрыяльная, колькі маральная. Людзі павінны ведаць, што яны — галоўная каштоўнасць, і свет не абыякавы да іх. А народная песня жыве, урэшце — у кампазітарскіх апрацоўках. Яна ўкараняецца ў маладзёжнае жыццё. І гэта — таксама выйсце: надзея на захаванне, рэпрадукцыю і рэгенерацыю аўтэнтычнага культурнага слою, няхай сабе і ў нейкіх другасных формах.

Віктар ВОЙЦІК:

— Згодны. Усё гэта трэба рабіць, каб абуджаць нацыянальную падсвядомасць. Такая песня, сапраўды, захавалася толькі ў нас. Калісьці Зінаіда Мажэйка здымала фальклорныя фільмы. Трэба вяртацца да такіх форм фіксацыі аўтэнтыкі, што, урэшце, і робіць з народа нацыю.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— І захоўваць неабходна не толькі носьбітаў, але і даследчыкаў стымуляваць...

Яўген РАГІН:

— Усё гэта так, але, тым не менш, за гады дзяржаўнай незалежнасці ў гэтым кірунку зроблена многае...

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Я ў пацвярджэнне вам вось які прыклад згадаю. Займаюся даследаваннем старадаўняй музыкі Беларусі, і магу вас запэўніць, што поспехі ў названай сферы наўпрост звязаны з незалежнасцю нашай краіны. Можна толькі здзіўляцца хуткасці і ўнікальнасці гэтага працэсу. Дакладна адказваю за свае словы: ніводная краіна свету, апрача Беларусі, не можа пахваліцца тым, што цягам жыцця аднаго пакалення была рэканструявана цэласная карціна развіцця музычнай культуры ва ўсіх яе кірунках. Маю на ўвазе тэкст, кантэкст, падтэкст, навуковыя і педагагічныя рэаліі...

Яўген РАГІН:

— І што, дваццаць гадоў таму гэтая праблематыка была незапатрабаванай?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Так. І не было ніякай надзеі, што рукапісы, вернутыя з-за мяжы (дарэчы, усе помнікі музычнай культуры адшуканы менавіта ў замежных сховішчах), спатрэбяцца. Дапамагло атрыманне дзяржавай незалежнасці. Краіна захацела спазнаць сваю протадзяржаўнасць, гісторыю. Памкненне — зразумелае: калі трактаваць паняцці нацыя і дзяржаўнасць без уліку культурных аспектаў, мы ніколі не зразумеем сваё мінулае, не толькі ў фальклорным увасабленні, але і ў высокіх элітных мастацкіх формах акадэмічнага гатунку.

Толькі разуменне нацыі і дзяржавы ў шырокім катэгарыяльным сэнсе дае адказ на ўсе без выключэння пытанні. Нацыя — супольнасць ва ўсіх яе праявах: этнічных, канфесійных, рэгіянальных. Гэтае разуменне дало нам ключ ад "гмаху", што ўзводзіцца сёння, а "падмурак" закладваўся цягам стагоддзяў... Цяпер старадаўняя музыка гучыць на поўную моц. Змены за дваццаць гадоў нашага культурнага жыцця адбыліся неймаверныя. Так што ў будучыню варта глядзець з аптымізмам.

Яўген РАГІН:

— Змены мы адсочваем пад час кожнай нашай камандзіроўкі. Якасна змянілася, да прыкладу, аблічча старажытнага Мсціслава. У тамтэйшага аддзела культуры — мноства ініцыятыў па развіцці турызму, па аднаўленні архітэктурнай спадчыны. Ігар Ільіч, вакол гэтых адраджэнцкіх працэсаў зараджаецца не толькі сельскі турызм, але і фестывальны рух віруе. Колькі слоў, калі ласка, пра гэтую старонку культурнай Магілёўшчыны.

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— У нас праводзіцца даволі шмат фестываляў, усе — розныя. Але, мушу сказаць, мы разглядаем іх не толькі як культурна-забаўляльную работу, але і як ідэалагічную працу, што спрыяе дабрабыту дзяржавы, звяртаючыся да нашых традыцый, нацыянальных каранёў. Давайце рушым ад згаданага вамі Мсціслава. У суседнім Горацкім раёне ладзіцца рэгіянальны фестываль дзіцячай творчасці "Славянскі карагод", з іншага боку, у Клімавічах, — Міжнародны фестываль народнай дзіцячай творчасці "Залатая пчолка". Крыху далей, на Касцюковіччыне, — абласны фестываль паэзіі. У Бабруйску літаральна ў гэтыя выхадныя — "Вянок дружбы", дзе будуць прадстаўлены паўтара дзясятка краін...

Яўген РАГІН:

— У сувязі з гэтым не магу не задаць пытанне пра дзейнасць апякунскіх саветаў. Наколькі ведаю, такі быў створаны пры "Залатой пчолцы"...

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Для нас гэта быў вельмі важны досвед, і — вельмі прыемны. Нечакана аказалася, што прамыслоўцы, прадстаўнікі сельскай гаспадаркі не толькі не шкадавалі грошай для дзіцячага фестывалю, а нават дадаткова прапаноўвалі свае паслугі ў самых розных кірунках. Бюджэт бюджэтам, але... Яшчэ больш важна і тое, што людзі — кіраўнікі, чыім клопатам з'яўляюцца камбайны ды фермы, — укладваюць грошы ў творчае самавыяўленне дзяцей, задумваючыся і пра тое, якою будзе наша нацыя ў будучыні, ужо праз дзесяць — дваццаць гадоў.

Яўген РАГІН:

— З гэтага вынікае наступнае пытанне: ці існуе ў вас праблема з пошукам інвестараў у рамках дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Прынамсі, на рэгіянальным узроўні — раённым ды гарадскім — людзі знаходзяцца. Не скажу, што яны ўкладваюць мільёны і мільярды, але тое, што ім пад сілу — робяць.

Яўген РАГІН:

— Іван Антонавіч, а ці лёгка было адкрыць фонд для Любчанскага замка?

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— На афармленне дакументаў мне спатрэбіўся амаль месяц. Але не займеўшы статуса юрыдычай асобы, мы не маглі б распачаць сваю дзейнасць.

Сёння ў нас шмат паплечнікаў: інтэлігенцыя, моладзь, прадпрымальнікі... Вельмі шкада, што, паводле дзеючага Закону аб рэкламе, я не магу падзякаваць праз вашу газету ўсім банкам і фірмам, якія аказваюць нам істотную дапамогу. Затое можна прыгадаць добрым словам таго любчанскага трактарыста, які просіць дазвол на працу ў нядзелю ў свайго пастара, каб таксама спрычыніцца да аднаўлення замка.

Антон СІДАРЭНКА:

— Любчанскі замак сёння ва ўсіх на слыху. Але ж у нас нямала і іншых выбітных помнікаў спадчыны, і многія з іх знаходзяцца ў руінах. Згадайма хаця б Быхаўскі замак, які ўжо набліжаецца да апошняй стадыі руйнавання...

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

— Калі б у нас было больш такіх людзей, як Іван Пячынскі, калі б раённыя ўлады ўсебакова дапамагалі такім энтузіястам на месцах, думаю, многія праблемы былі б вырашаны. Бо энтузіясты — ёсць. Прыкладам, мой калега — мастак Кастусь Качан будуе ў Навагрудку галерэю за свае грошы, каб там з'явіўся асяродак творчага жыцця. Сёння ён просіць мясцовыя ўлады аб нязначнай падтрымцы, якой яму не стае, каб "запусціць" сапраўды патрэбны для горада аб'ект.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Надоечы пабывала ў Лідзе. Замак рэстаўруецца, і сёння ён надзвычай запатрабаваны: там адбываюцца і шлюбныя цырымоніі, і розныя рыцарскія імпрэзы, прычым усё гэта выглядае вельмі арганічна. Угэўнена, што да часоў незалежнасці аб такім варыянце развіцця падзей не выпадала нават і марыць. Як і пра бульвар Гедыміна, які нядаўна з'явіўся ў Лідзе, або кавярню "Грунвальд"... Дарэчы, у Мінску вуліца Напалеона Орды ўжо ёсць, а вось вуліцы Станіслава Манюшкі, які столькі часу пражыў у гэтым горадзе, — пакуль што няма... Хаця трэба акцэнтаваць прыналежнасць гэтай постаці да беларускай культуры. Падкрэслю: мы не імкнёмся "скрасці" чужых герояў! Мы проста павінны адстойваць сваё законнае права на агульную спадчыну.

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Любчанскі замак аднаўляецца на народных, валанцёрскіх пачатках, без дзяржаўных сродкаў. Спярша я вельмі хацеў атрымаць дапамогу з бюджэту, але ж цяпер бачу: яна для нас неабавязковая.

Ілья СВІРЫН:

— А ці ёсць у вас канцэпцыя выкарыстання сядзібна-замкавага комплексу? Што там будзе пасля рэстаўрацыі?

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Працэнтаў на 95 гэтая канцэпцыя ўжо гатова. Стварыць яе аказалася не самай простай задачай: пэўныя карэктывы даводзілася ўносіць ужо па меры прасоўвання рэстаўрацыі. Але агульны прынцып — вельмі просты: трэба пастарацца аднавіць тое, што было раней.

У брамнай вежы, дзе месцілася варта, прапануем стварыць адпаведную экспазіцыю. У другой вежы быў ці не першы музей у нашых краях — кунсткамера Радзівілаў. Дык давайце паспрабуем яе аднавіць. У гасцявым дамку можа размясціцца невялічкі гатэль на дваццаць месцаў. У палацы мэтазгодна зрабіць музей уладальнікаў замка.

Віктар ВОЙЦІК:

— Працягваючы тэму сучаснасці, хачу зазначыць: на сённяшні дзень нам удалося захаваць высокі ўзровень музычнай адукацыі ў спецыяльных установах, дзякуючы чаму ў краіне вырасла вялікая колькасць музыкантаў сусветнага ўзроўню.

(Працяг на стар. 4 — 5.)

(Працяг. Пачатак на стар. 3.)

Яны атрымліваюць перамогі на самых прэстыжных міжнародных конкурсах. Раней мы пра такое маглі толькі марыць! А колькі з'явілася абноўленых канцэртных пляцовак дзякуючы таму, што дзяржава ўклала грошы ў іх мадэрнізацыю: Белдзяржфілармонія, Вялікі тэатр, неўзабаве паўстане і Дзіцячая філармонія…

У часы Савецкага Саюза наша музычная дзялянка была, я сказаў бы, вельмі добра апрацаваная, па-гаспадарску. Так, тое быў высокі гатунак. Але калі раптам тут выраслі нейкія незразумелыя, "незапланаваныя парасткі", яны часцяком прызнаваліся пустазеллем і выкарчоўваліся. І такі падыход не даваў беларускаму мастацтву панарамнага развіцця.

Як сказаў некалі Стравінскі, усе мы, кампазітары, — музычны перагной, і пішам свае творы для таго, каб на гэтай нашай глебе ўвесь час узрастала новае мастацтва, каб тыя парасткі, што прабіваюцца, мацнелі, а потым — давалі сваё насенне. Канешне, хтосьці можа зараз пачаць марыць пра своеасаблівыя "аранжарэі", дзе пачнуць вырошчвацца ўсялякія экзатычныя "фрукты", аднак адкажу: гэта не клопат дзяржавы, і ва ўсім свеце тое — плён уласнай ініцыятывы. Так, мы маглі б збочыць да гадавання выбранай музычнай эліты, зносіць туды ўвесь урадлівы грунт… Але ведаю, што большасць нашых людзей змогуць "спажываць" такое мастацтва толькі зрэдчас. У той час як важнае судакрананне з роднай культурай адбываецца кожны дзень.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— А, між іншым, людзі па-ранейшаму ідуць у нашу кампазітарскую прафесію, і Акадэмія музыкі ёсць гарантыя яе будучыні: на сённяшні дзень у нас сфарміравалася моцная школа, якая задае тон развіццю музычнага мастацтва і забяспечвае бесперапыннасць музычна-гістарычнага працэсу. Кажу так не таму, што загадваю кафедрай беларускай музыкі (хаця, дарэчы, яе стварэнне ў 1991-м — таксама вынік атрымання незалежнасці нашай дзяржавай), а таму, што ўсе нашы выхаванцы настолькі зацікаўлены менавіта беларускай праблематыкай, што літаральна днямі да мяне прыйшлі студэнты і сказалі: жадаем выправіцца ў фальклорную экспедыцыю за свае сродкі!..

Слушную думку выказаў спадар Войцік: элітнае мастацтва ў наш час і ў часы Моцарта было розным. Сёння мы ўпор робім на класіку, але тады плацілі не за старадаўнюю, а менавіта за сучасную музыку. І Моцарт быў сучасным кампазітарам! Але з часу, як пачалося размежаванне музыкі папулярнай і элітнай, і з'явіліся ўсе гэтыя хібы. Таму гэта пытанне агульнага стану музычнага мастацтва на планеце — пытанне глабалізацыі.

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

— І ў нас дастаткова, так бы мовіць, спажыўцоў высокага мастацтва! Прынамсі, на нашых музейных імпрэзах залы перапоўнены. І для кожнай такой імпрэзы складаем адпаведныя — эксклюзіўныя — культурныя праграмы. Спецыяльна для гэтага мы закупілі сто раскладных крэслаў, якія дазваляюць нам ствараць мабільную канцэртную пляцоўку ў любым месцы. Прыкладам, гэтым летам у нас запланавана тры канцэрты з музыкантамі Дзяржаўнай філармоніі, — білеты распрадаюцца імгненна! І прыходзіць — сапраўдны глядач.

Так, у сучасным грамадстве вельмі востра паўстала праблема густу. Ёсць папса, і ёсць высокае мастацтва — не толькі ў музыцы, але і ў жывапісе, і ў літаратуры. Таму мы, усе тыя, хто сядзіць за гэтым "круглым сталом", павінны захоўваць і развіваць кропкі духоўнасці і ператвараць іх у сапраўдныя асяродкі нацыянальнай культуры. Усе вы ведаеце пра праект "Ноч музеяў", які ў апошнія гады па ініцыятыве французскіх калег праводзім і мы. Але я не хачу ісці за Францыяй, а — стварыць сваю, беларускую, Ноч музеяў. І прымеркаваць яе да Свята айчынных работнікаў культуры. У нас ужо амаль складзена праграма мерапрыемстваў. Сярод іншага, будзе і прэзентацыя кніг, дыскаў з фільмамі, прысвечанымі знакамітым беларускім мастакам, самому Мастацкаму музею... Я перакананы, што наша задача — прапагандаваць, у першую чаргу, менавіта нацыянальную культуру.

Ілья СВІРЫН:

— Не магу не зазначыць, што яшчэ 20 гадоў таму ніхто б не паверыў не толькі ў музейную ноч, тым больш — made in Belarus, але і ў тое, што Нацыянальны мастацкі музей Беларусі здолее наладзіць супрацоўніцтва з самім Луўрам, нават выставіць там, у найпрэстыжным музеі свету, жывапіс айчыннага майстра XIX стагоддзя Івана Хруцкага.

Антон СІДАРЭНКА:

— Сустракаючыся з дырэктарам слыннага музея Анры Луарэтам, Уладзімір Пракапцоў прадстаўляў незалежную Беларусь. І менавіта таму быў успрыняты "на роўных", як паўнапраўны партнёр.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Вось калі б і іншыя засвоілі ваш, шаноўны Уладзімір Іванавіч, вопыт агрэсіўнай рэкламы, у нас былі б вынікі нашмат больш яркія.

Ігар КУЗНЯЦОЎ.

Вольга ДАДЗІЁМАВА.



Віктар ВОЙЦІК.

СУВЕРЭНІТЭТ,

Незалежная Бацькаўшчына: тэндэнцыі за дваццаць гадоў, праекты на наступныя дваццаць

Яўген РАГІН:

— Сталіца сталіцай, але ж на сённяшні дзень у нас існуюць і філарманічныя пляцоўкі ў кожным аграгарадку. На адной толькі Магілёўшчыне іх, калі не памыляюся, 200! Наколькі актыўнае творчае жыццё там?

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Сёння філарманічная пляцоўка проста не можа існаваць, калі яна не абсталявана ўсім неабходным для таго, каб прымаць не толькі самадзейных, але і прафесійных артыстаў. Прыкладам, у нас практычна ў кожнай з іх маецца імпартны раяль. І, мушу сказаць, з часу іх з'яўлення вяскоўцы пачалі ставіцца да іх па-іншаму: ведаюць, што будзе канцэрт — прыходзяць, загадзя набываюць білеты.

Антон СІДАРЭНКА:

— Хачу запытацца ў спадара Барсукова: вы, у асноўным, працуеце з маладымі мастакамі, маладымі наведвальнікамі. На ваш погляд, чалавек, што сфарміраваўся за 20 гадоў нашай незалежнасці, якімі рысамі адрозніваецца ад больш сталага пакалення?

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Гэта, у першую чаргу, людзі зусім іншага светапогляду. І яны адкрытыя для новага, нестандартнага. Сапраўды, заўважаю, што ўсе нашы нестандартныя выстаўкі, якія правакуюць на крэатыў, актыўна наведваюць маладыя людзі: ім гэта падабаецца. Ды, зрэшты, не толькі ім — людзі старэйшага ўзросту таксама з інтарэсам сочаць за творчасцю прафесіяналаў новай генерацыі.

Ілья СВІРЫН:

— Часта бывае, што маладое пакаленне папракаюць у нейкай касмапалітычнасці, меркантыльнасці. Наколькі гэта адпавядае рэчаіснасці, прынамсі, у дачыненні да маладых мастакоў?

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Сёння жывём усё-такі ў вялікім свеце, і за кошт разнастайных сродкаў сувязі, Інтэрнэта інфармацыйная прастора значна пашырылася. Таму нельга так абвінавачваць маладых: гэта натуральна і нармальна, бо для таго, каб гадаваць сваю беларускую культуру, мы павінны існаваць у кантэксце культуры сусветнай.

Ілья СВІРЫН:

— А ці ёсць у такой сітуацыі менавіта нацыянальная самаідэнтыфікацыя беларускіх мастакоў?

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Канешне! Гэта заўсёды будзе наша нота ў сусветным мастацкім аркестры — мы павінны сказаць і беларускія словы ў сучасным мастацтве.

Антон СІДАРЭНКА:

— Пад час размовы некалькі разоў прагучала тэма глабалізацыі. У сувязі з гэтым, не магу не запытацца, наколькі наша мастацтва канкурэтназдольнае ў агульнасусветнай культурнай прасторы?

Віктар ВОЙЦІК:

— Думаю, неабходнасць больш актыўнага прасоўвання нацыянальнай культуры на сусветны ўзровень — акурат тая задача, якая сёння востра стаіць перад усімі намі. Да мяне прыязджае шмат самых розных музыкантаў з-за мяжы, і ўсіх іх я стараюся знаёміць з нашай краінай, прычым важу не толькі ў Мір, Нясвіж ды па Мінску, але і нават у невялічкія музеі. Прыкладам, у Заслаўі ёсць унікальны музей з цудоўнай калекцыяй старадаўніх музычных інструментаў, многія з якіх — самаробныя. Гэтая экспазіцыя, перакананы, магла б стаць надзвычай цікавым турысцкім аб'ектам. Аднак і там, і практычна паўсюль, дзе бываю з замежнікамі (за выключэннем хіба Міра), сутыкаюся з тым, што немагчыма знайсці ні буклетаў на замежных мовах, ні якой іншай рэкламнай прадукцыі.

А як я знаёмлю сваіх калег-музыкантаў з беларускай музыкай? Збольшага — дзякуючы прыватным зборам запісаў...

У кантэксце "круглага стала"

Нацыянальная бібліятэка стала сапраўдным сімвалам інтэлектуальнага багацця Беларусі. І адным з найбольш прэстыжных, прадстаўнічых цэнтраў міжнародных кантактаў: ад сустрэч на найвышэйшым узроўні да стасункаў прафесіяналаў.

З 25 па 28 чэрвеня на базе НББ прайшла Генеральная асамблея кансорцыума EIFL (Electronic Information for Libraries: электронная інфармацыя для бібліятэк) — міжнароднай некамерцыйнай арганізацыі, галоўнымі накірункамі дзейнасці якой з'яўляюцца падтрымка абмену ведамі ў глабальным маштабе, пабудова сеткі неперарыўнага павышэння адукацыі, а таксама падтрымка нацыянальных бібліятэчных кансорцыумаў. Прадстаўнікі прыкладна 50 краін СНД, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, Афрыкі, Азіі абмеркавалі пытанні пераадолення бар'ераў па выкарыстанні электронных рэсурсаў, аўтарскага права ў кантэксце міжнароднай палітыкі, правялі перамовы з вытворцамі і пастаўшчыкамі электронных інфармацыйных рэсурсаў.

Маштабны міжнародны форум стаўся нагодай гутаркі карэспандэнта "К" з дырэктарам Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, доктарам педагагічных навук Раманам МАТУЛЬСКІМ напярэдадні Дня Незалежнасці краіны. І першае, аб чым разважае госць "К" — якраз міжнародныя стасункі.

Тое, што можа зрабіць

Пра імідж

— Лічу, падобны знакавы форум немагчыма было б правесці гадоў 25 таму. Бо, па-першае, Савецкі Саюз меў іншую канцэпцыю развіцця, і такіх задач інфармацыйнай інтэграцыі, удзелу ў падобных адкрытых праграмах і праектах, тым больш — па інфармацыйным абмене, перад савецкай дзяржавай не стаяла, ды і, у прынцыпе, не магло стаяць. Па-другое, мерапрыемства такога буйнога ўзроўню, натуральна, праводзілася б у цэнтры, у сталіцы СССР, і, канешне ж, магчымасць таго, што форум адбыўся б у Мінску, была зусім невялікая. Толькі цяпер, у нашай незалежнай Беларусі, мы можам сапраўды паказаць свету, хто мы ёсць. І я ведаю з размоў з маімі калегамі, якія прыехалі на сённяшні форум, што яны здзіўлены, уражаны Мінскам, будынкам Нацыянальнай бібліятэкі, Беларуссю ўвогуле.

Пра здабыткі бібліятэчнай сферы

— Сапраўды, два дзесяцігоддзі даюць магчымасць падвесці пэўныя вынікі нашага развіцця. І гэтыя вынікі мы бачым на ўсіх накірунках. Яны звязаны не толькі з палітыкай, не толькі з эканомікай, але і з развіццём сацыяльнай сферы — адукацыі, навукі, культуры, і бібліятэчная сфера ў нашай краіне з'яўляецца сутнасным складнікам агульнага развіцця Беларусі. Галоўны вынік у гэтым кірунку, на маю думку, — наша сённяшняя Нацыянальная бібліятэка. Бо гэта сапраўдны сімвал нашай незалежнасці, і глыбока сімвалічна, што беларуская дзяржава, яе Кіраўнік і народ такім чынам дэманструюць свае прыярытэты. Бо гэтая бібліятэка дазволіла захаваць усе тыя кніжныя каштоўнасці, якія знаходзіліся да таго часу, скажам шчыра, у не надта спрыяльных умовах. А кнігі, якія пражылі стагоддзі, заслугоўваюць большага, чым, кажучы папросту, бадзяцца па падвалах і непрыстасаваных памяшканнях. Цяпер усё наадварот: кнігі знаходзяцца ва ўтульных памяшканнях, дзе ім камфортна, і дзякуючы гэтаму яны могуць існаваць яшчэ цягам стагоддзяў.

Пра інтэграцыю ў інфармацыйныя працэсы

— Доступ нашай краіны, нашых карыстальнікаў да сусветных інфармацыйных рэсурсаў дазволіў нам стаць роўнымі сярод роўных, а ў большасці выпадкаў — і лідарамі ў бібліятэчнай справе... І тое датычыцца не толькі гістарычнага ці культуралагічнага кантэксту. Сучасныя інфармацыйныя рэсурсы — гэта прагматыка, тое, што дазваляе развіваць, у першую чаргу, адукацыю, навуку, а праз гэта — і эканоміку, рэальны сектар нашай вытворчасці, прамысловасць, сельскую гаспадарку, сферу паслуг. Бо доступ да сусветных рэсурсаў дазваляе атрымліваць інфармацыю пра апошнія навуковыя дасягненні, тэхналагічныя і эканамічныя вынікі, новыя вынаходніцтвы, маркетынгавыя падыходы. Валодаючы гэтай інфармацыяй, нашы вытворцы могуць ствараць канкурэнтаздольную прадукцыю на ўзроўні сусветных стандартаў. Вось што вельмі важна, вось што галоўнае. Да таго ж, мы з'яўляемся бясспрэчнымі лідарамі па доступе да сусветнай інфармацыі на постсавецкай прасторы, а нашы еўрапейскія калегі прызнаюць за намі пэўнае лідарства ў Еўропе па дадзеным паказчыку.

Мы забяспечваем доступ не толькі да Інтэрнэта. Бо я пакуль не ведаю прыкладаў, каб хтосьці быў здольны прыдбаць сабе для хатняга карыстання інфармацыйную базу даных, што каштуе дзясяткі тысяч валютных сродкаў. Гэта можа зрабіць толькі дзяржава, і гэта ўвасоблена ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У нашай установе створаны такія ўмовы, калі, напрыклад, любы студэнт вышэйшай навучальнай установы Беларусі мае магчымасць атрымаць доступ да той жа інфармацыі, што і студэнт або прафесар Кембрыджскага або Оксфардскага ўніверсітэтаў. Я лічу тое адным з галоўных дасягненняў у гэтай сферы для нашай краіны. Дарэчы, гэта можна зрабіць не толькі ў Нацыяналцы, але і праз сістэму віртуальных чытальных залаў амаль ва ўсіх навучальных установах Беларусі і абласных бібліятэках. Цяпер распачалася праца па ўкараненні дадзеных магчымасцей у раённых бібліятэках.

Пра стандарты і дасягненні

— Адно з дасягненняў — гэта тое, што незалежная Беларусь захавала сетку бібліятэчных устаноў, якія былі створаны за савецкім часам, нягледзячы на ўсе складаныя абставіны. Другое дасягненне, не менш важнае, — гэта захаванне інфармацыйных рэсурсаў, фондаў бібліятэк. Бо ў нашай маладой дзяржаве ў пэўны пе-

ТВОРЦА, ПЕРСПЕКТЫВЫ

"Круглы стол" "К"

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

— Адзін з апошніх прыкладаў ад нашых мастакоў. Сёлета яны зрабілі толькі першы крок на Венецыянскім біенале. Многія краіны не толькі ўбачылі Беларусь мастацкую, даведаўшыся больш пра нас і нашу культуру. З'явіліся і пэўныя творчыя прапановы. А калі б гэтыя звесткі распаўсюджваліся раней, сёння пра нас ведалі б значна больш. Нехта скажа: маўляў, мастак жа выстаўляе ўласныя творы і, адпаведна, піярыць сябе, зарабляе на гэтым грошы. Аднак нельга забывацца, што ў гэты ж самы момант ён яшчэ і прэзентуе ўласную краіну, нашу нацыянальную культуру!

Я згодны з тым, што наша прысутнасць у інфармацыйным "павуцінні" павінна быць большая. Цяпер, ведаю, Беларускі саюз мастакоў зрабіў свой сайт. Але ж гэтага мала — патрэбна, каб не толькі Саюз ды Мастацкі музей, а кожная ўстанова культуры, кожны наш творца мог быць "знойдзены" ў Сеціве, каб інфармацыя пра нас прысутнічала і ў розных мастацкіх галерэях Еўропы. Сёння мы шмат спасылаемся на класікаў, якія ў свой час сказалі важкае слова ў мастацтве і тым засталіся ў стагоддзях. Але ж сёння, у XXI стагоддзі, творцам новага пакалення, нашым сучаснікам мы таксама павінны даць магчымасць сказаць гэтае сваё важкае слова.



Дзяніс БАРСУКОЎ.



Уладзімір ПРАКАПЦОЎ.



Іван ПЯЧЫНСКІ.

Віктар ВОЙЦІК:

— У адрозненне ад мастацкага твора, які можа існаваць сам па сабе, музыка жыве толькі тады, калі выконваецца. Можна выдаць зборнік нот, прадаць яго, паставіць на паліцу ў бібліятэцы. Але жыццё музыцы надае толькі яе выкананне! Не гучыць нацыянальная музыка — значыць, і ніяк не ўплывае ні на канкрэтнага слухача, ні на наступныя пакаленні.

Возьмем па аналогіі Парыж канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Няхай нехта не пагодзіцца, але я лічу, што гэта быў не столькі выбітны асяродак культуры, колькі геніяльны цэнтр менеджменту — такі, дзе мастацкія работы ператвараліся ў матэрыяльныя каштоўнасці. Дзякуючы гэтаму яны і імёны іх стваральнікаў захаваліся па сённяшні дзень.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Але пытанне ў нас было: ці пазнавальныя беларусы ў свеце?

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Сустрэчнае пытанне: а ці ведаеце вы, што ў Любчы ў 1621-м быў створаны канцыянал — зборнік духоўных песень?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Скажу нават больш: я асабіста знайшла яго ў архівах. Ён ужо выкананы, і я магу вам даць паслухаць дыск. Увогуле ж, лічу, што пазнавальнасць Беларусі ў свеце забяспечваюць, у тым ліку, і прызы, якія бяруць нашы музыканты на прэстыжных міжнародных конкурсах. Айчынная школа цэніцца ў свеце высока, і таму нашы маладыя музыканты атрымліваюць спакуслівыя прапановы з-за мяжы. У той самы час, у Акадэміі музыкі — сапраўдны наплыў кітайскіх студэнтаў. Такі попыт — яшчэ адно сведчанне высокага міжнароднага прызнання нашай акадэмічнай школы. Лічу, яна з'яўляецца своеасаблівым брэндам Беларусі. І з'явіўся ён менавіта ў гады незалежнасці.

Віктар ВОЙЦІК:

— Некалі мне даводзілася прадстаўляць музычную беларускую культуру ў Англіі. Імпрэза адбывалася ў царкве, для непадрыхтаванай публікі. І я бачыў, як у людзей літаральна гарэлі вочы, яны слухалі і дзякавалі. У вельмі сціслай форме я спрабаваў рэпрэзентаваць багатую гісторыю музычнай культуры нашай краіны.

Ілья СВІРЫН:

— Дзякуючы вам, спадарыня Вольга, ды іншым даследчыкам, мы са здзіўленнем адкрываем усё новыя яе старонкі. І тут у мяне ўзнікае пытанне. "Белых плям" на глобусе, здаецца, ужо не засталося: усё ў гэтым свеце вядома і ўсё вывучана. А вось музыка Беларусі мінулых стагоддзяў — terra incognita, час асваення якой прыспеў толькі нядаўна. Чаму так?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Лічу, гэта мае непасрэднае дачыненне да тэмы нашай гутаркі — незалежнасці краіны. Бо да атрымання яе доўгія гады ў беларусаў выхоўваўся гэткі храналагічны правінцыялізм — я б яго так назвала. У гісторыі ведалі толькі верхні слой, а тое, што сягала ў глыбіню стагоддзяў, заставалася па-за ўвагай. Натуральна, праводзіць такія "раскопкі" афіцыйна не забаранялася, але... у той самы час, гэта і не заахвочвалася.

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Я заклікаю нашых гісторыкаў пазбыцца сваёй сціпласці. Нам трэба больш актыўна адстойваць і прапагандаваць уласны погляд на мінуўшчыну. Але ці здатныя мы сёння данесці гэтыя свае погляды на сваю ж гісторыю хаця б да бліжэйшых суседзяў? А да суайчыннікаў?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Наша задача, пераканана, у іншым: актыўна адстойваць і распаўсюджваць свой погляд на ўласную гісторыю.

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Трэба, каб пра гэтыя карані ведаў кожны грамадзянін краіны, пачынаючы са школы ці нават дзіцячага садка.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Пачытайце тэсты па гісторыі для выпускнікоў школ, і вы пераканаецеся, што адукацыйная праграма гэтыя веды ўтрымлівае. Дзеці сёння надзвычай адукаваныя і абазнаныя ў мінуўшчыне. Так, можна крытыкаваць цяперашнія падручнікі, але ж пры гэтым нельга адмаўляць вялізнай якаснай розніцы паміж падручнікамі, якія з'явіліся ўжо за часы незалежнасці, і тымі, па якіх вучыліся мы.

Яўген РАГІН:

— Магчыма, Іван Антонавіч мае рацыю, і нам сапраўды не хапае большай упартасці ў адстойванні свайго. У адваротным выпадку, такіх дабрачынных фондаў, як "Любчанскі замак", у кожным з нашых рэгіёнаў было б па некалькі...

Ілья СВІРЫН:

— Мяркую, гэтае пытанне спадар Пячынскі чуе ўжо не ўпершыню, але... Усё ж не магу яго не задаць. Дадзены сюжэт папраўдзе варты экранізацыі: звычайны грамадзянін Беларусі, які не мае рахунку ў швейцарскім банку і заможных сваякоў, раптам бярэцца адрадзіць сваімі сіламі цэлы замак. Чаму? Што вас падштурхнула?

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Мая кар'ера складалася вельмі няблага, я займаў даволі высокія пасады, дайшоўшы па службовай лесвіцы нават да ўрадавых структур. Але... Раптам узніклі сур'ёзныя праблемы са здароўем. І тады я падумаў: ну і які сэнс ва ўсіх тых тваіх дасягненнях? Шмат людзей было гэткіх самых, як і ты, і нічога ад іх не засталося, бо кар'ерны поспех — тленны. Іншая рэч — гісторыя твайго роднага краю. А Любча заўсёды займала асаблівае месца ў гісторыі Беларусі — я перакананы, што менавіта тут знаходзілася сталіца летапіснай Літвы, ды і нямала таму ёсць гістарычных сведчанняў. І вось, аднойчы я пабяцаў, што калі Гасподзь верне мне здароўе, я вазьмуся за адраджэнне замка. І цяпер выконваю абяцанне.

Антон СІДАРЭНКА:

— Пытанне, што хацелася б задаць усім удзельнікам нашай гутаркі: якой вы жадалі б бачыць сваю сферу і нашу культуру ў цэлым праз наступныя дваццаць гадоў? Якія вашы прагнозы і мары?

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

— Мая самая галоўная мара — стварыць у цэнтры Мінска Музейны квартал. Таму хацеў бы запрасіць усіх прыхільнікаў сустрэцца ў гэтым дзівосным месцы гадоў гэтак праз дваццаць. Пасядзім з вамі ў добрай кавярні з доступам у Інтэрнэт, дзе столікі размешчаны непасрэдна ва ўтульным дворыку. Ахвотныя здолеюць набыць не толькі друкаваную прадукцыю і самыя разнастайныя сувеніры, але і творы сучасных беларускіх мастакоў самых розных накірункаў. А пасля нашай гутаркі наведаем якую-небудзь цікавую тэатральную або музычную імпрэзу. Мы і сёння ўжо маем вялікую ахвоту праводзіць іх у больш маштабным фармаце, але... пакуль што бракуе плошчаў. А ў Музейным квартале іх будзе дастаткова. Упэўнены, гэтае месца ўсім спадабаецца, яно стане адным з цэнтраў жыцця сталіцы.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— І згаданы ўжо Любчанскі канцыянал, і многія іншыя скарбы айчыннай культуры раскіданы цяпер па замежных сховішчах. Хацелася б верыць, што праз дваццаць гадоў яны вернуцца на радзіму — хай сабе і ў выглядзе копій.

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Я вельмі хацеў бы, каб праз дваццаць гадоў нашы суайчыннікі не саромеліся сваёй мовы. Хай сабе напачатку гэта будуць нейкія сакавітыя слоўцы, якія з'яўляюцца ў гутарцы. Мару, каб гэта стала модным на любым узроўні...

(Заканчэнне на стар. 6.)

толькі дзяржава

Прыярытэты з векавымі каранямі і сучаснымі тэхналогіямі

рыяд склалася такая сітуацыя, калі бібліятэкі амаль не камплектаваліся новымі выданнямі. Але дзякуючы Указу Прэзідэнта Беларусі было прынята рашэнне выдаткоўваць на абнаўленне фондаў не менш за 15 працэнтаў ад агульнай сумы фінансавання бібліятэк. І гэта дало штуршок таму, каб у бібліятэкі пачала паступаць новая літаратура, новыя кнігі, газеты і часопісы. У далейшым, я спадзяюся, гэты стандарт-мінімум будзе не толькі захаваны, але мясцовыя ўлады будуць выдаткоўваць і больш фінансавых сродкаў на закупку новай літаратуры. Ну, і трэцяе — гэта камп'ютарызацыя нашых бібліятэк, падключэнне іх да электронных камп'ютарных сетак, стварэнне нацыянальнай бібліятэчнай электроннай сістэмы, а таксама падключэнне да сістэмы віртуальных чытальных залаў, што адбываецца цяпер, як і падключэнне да сусветных інфармацыйных рэсурсаў. Гэта будучыня, якой не трэба ні баяцца, ні супрацьпастаўляць ёй мінулае. Нішто не пагражае традыцыйнай кнізе, яна была, ёсць і будзе, але не трэба лічыць, што яна будзе адзінай, што сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі з'яўляюцца ворагамі кнігі. Мы павінны радавацца, што ёсць новыя тэхнічныя магчымасці, якія трэба выкарыстоўваць на карысць усім людзям.

Пра вяртанне каштоўнасцей у "лічбе" і...

— Беларусь — краіна старажытнай кніжнай культуры. Больш за тое: гэта краіна, якая запачаткавала распаўсюджванне кнігі на ўсходнеславянскіх землях. Не трэба забываць, што адна з першых бібліятэк усходніх славян — гэта бібліятэка Полацкага Сафійскага сабора, якая фактычна ўзнікла і развівалася побач з бібліятэкай Яраслава Мудрага. Але, у адрозненне ад іншых старадаўніх бібліятэк, мы захавалі карані і нават кнігі з дадзенай бібліятэкі. Тыя кнігі, праўда, — не на тэрыторыі Беларусі, і трэба працаваць над тым, каб іх вярнуць, але гэта ўжо іншая справа. Самае галоўнае, што яны ёсць. Не трэба таксама забываць, што менавіта наша краіна дала ўсяму ўсходнеславянскаму свету першадрукара Францыска Скарыну, які зрабіў сапраўдную рэвалюцыю не толькі ў кніжнай сферы, але і ў развіцці ўсходніх славян.

Але, на жаль, так здарылася, што ў XX стагоддзі развіццю кніжнай культуры, кніжнай спадчыны надавалася, на маю думку, недастаткова ўвагі. У пэўны перыяд быў этап забыцця каранёў, забыцця мінулага: ніхто не вывучаў рэлігійную кнігу, фонды тых магнацкіх родаў, што жылі на Беларусі, і шматлікія калекцыі былі забыты. І якраз новая незалежная Беларусь, ідэалогія нашай дзяржавы дазволілі нам вярнуцца да каранёў, да даследаванняў айчыннай кніжнай спадчыны. І гэтае вывучэнне пачалося амаль з першых гадоў Незалежнасці. Цягам дваццаці гадоў нарадзіліся такія буйныя праекты, як "Радзівіліяна", падтрыманая UNESCO, над якой працуюць даследчыкі як з Беларусі, так і з Расіі, Польшчы, Украіны, Літвы. Напрыклад, зусім нядаўна была прэзентавана "Сапегіяна" ў Ружанах — сумесны праект з Расійскай Федэрацыяй, але мы плануем прыцягнуць да яго калег з іншых суседніх краін. Нядаўна мы завяршылі першы этап праекта, таксама падтрыманы UNESCO, такі, як узнаўленне бібліятэкі Храптовічаў, якая цяпер знаходзіцца на Украіне. Зразумела, што мы працуем над спадчынай Францыска Скарыны. Усе гэтыя праекты, якія я называю, увайшлі ў Дзяржаўную праграму "Культура Беларусі" на 2011 — 2015 гады, і таму мы маем намер правесці больш грунтоўныя навуковыя даследаванні па выяўленні тых кніжных калекцый, якія былі ў Беларусі, даведацца, дзе яны знаходзяцца цяпер, а пасля правядзём бібліяграфічную рэканструкцыю і створым электронныя каталогі для таго, каб гэта было даступна ўсім, у першую чаргу — моладзі, якая больш актыўна працуе цяпер з электроннымі рэсурсамі.

Пра фундамент Незалежнасці

— Я лічу, што стварыць суверэнную, незалежную дзяржаву Беларусь, яе ідэалогію і сістэму нацыянальных каштоўнасцей немагчыма без апоры на глыбокія, векавыя карані культуры, гісторыі. Немагчыма ўзвесці высокі будынак на слабым фундаменце, немагчыма, каб вырасла велізарнае дрэва без каранёў. І толькі калі мы вывучым тысячагадовую гісторыю беларускіх земляў, культуру беларускага народа, толькі калі мы будзем усё гэта ведаць і гэтым ганарыцца, толькі тады наша дзяржава будзе моцнай, будзе існаваць стагоддзі і тысячагоддзі, як роўная сярод роўных і годная сярод годных.

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА

Намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Віктар КУРАШ збіраўся прыняць удзел у нашым "круглым стале" з нагоды Дня Незалежнасці (матэрыялы гутаркі апублікаваны на стар. 3 — 5). Але не атрымалася: намеснік міністра выправіўся ў тэрміновую камандзіроўку па рэгіёнах. Мы сустрэліся з Віктарам Іосіфавічам зранку ў панядзелак, 27 чэрвеня, паміж міністэрскімі планёркамі. А тэма гутаркі была ўсё тая ж: эвалюцыя нацыянальнай культуры цягам двух дзясяткаў гістарычных гадоў найноўшай беларускай дзяржаўнасці.

Ключ да аб'екта

У кантэксце "круглага стала"

— Што ж знакавага, на ваш погляд, адбылося ў нашай культуры за гэты час?

— Самае знакавае, што Кіраўнік дзяржавы вызначыў культуру (і гэта зафіксавана ў матэрыялах III і IV Усебеларускага сходаў) як стратэгічны рэсурс дзяржавы, што ў многім уплывае на яе развіццё.

Карэнныя змены адбыліся ва ўмацаванні матэрыяльнай базы, і гэта наўпрост тычыцца той дзейнасці, якой я цягам двух апошніх гадоў займаюся. Таму сярод знакавых падзей назаву інвеставанні ў ахову гісторыка-культурнай спадчыны, у будаўніцтва, рэканструкцыю, рамонт. І дынаміка тут сапраўды вельмі істотная. Калі ў 2006-м Міністэрству культуры ў адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай было выдаткавана 69,3 мільярда рублёў, дык у бягучым годзе — ужо 174,3 мільярда. Гэта ў два з паловай разы больш, чым у 2006-м, і ледзь не ў пятнаццаць разоў — чым у 2004 годзе. На пэўныя аб'екты сумы дзяржаўнай падтрымкі станавіліся і значна большымі: звыш 180 мільярдаў рублёў, скажам, было выдаткавана на аднаўленне Вялікага тэатра.

— Яшчэ адзін аб'ект нашага гонару — Нацыянальная бібліятэка Беларусі. Дзяржава ўзводзіла яе пры самым актыўным удзеле ўсёй нацыі. Больш падрабязна, калі ласка, пра тыя знакавыя аб'екты айчыннай культуры, увод якіх дваццаць гадоў таму быў бы проста немагчымым.

— За гады нашай незалежнасці шмат зроблена і па выкананні Дзяржпраграмы, што паклікана ахоўваць нашу гісторыка-культурную спадчыну. Як вы ведаеце, краіна ў эпоху Сярэднявечча мела каля 116 замкаў. Захаваўся ў розным стане 21, два з іх — Мірскі і Нясвіжскі — увайшлі ў Спіс сусветнай спадчыны UNESCO. Мірскі замак здалі летась, і ён паспеў за гэты час стаць сапраўдным цэнтрам турыстычнага паломніцтва, традыцыйным месцам правядзення важных дзяржаўных сходаў, пасяджэнняў калегій Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь…

— Вялікі рэзананс у айчынных СМІ займела будучая здача замка ў Нясвіжы. Ваша стаўленне да публікацый і ацэнка ходу замкавага аднаўлення?

— Я цудоўна разумею трывогу журналістаў за стан помнікаў архітэктуры, якія дзесяцігоддзямі выкарыстоўваліся як складскія або іншага гаспадарчага прызначэння памяшканні… А цяпер справы актыўна рухаюцца. Сёлета здадзім і Нясвіжскі палац…

— Наколькі ведаю, замежныя эксперты вельмі станоўча ацэньваюць рэстаўрацыйныя захады ў Нясвіжы?

— Цягам апошняга года нас наведалі тры экспертныя групы. Першую ўзначальваў доктар Міхаэль Петцэт, які цягам трох скліканняў стаяў на чале еўрапейскага ICOM'а. Ён абышоў усе памяшканні Нясвіжскага палаца, паглядзеў на методыкі работ і даў вельмі высокую ацэнку рэстаўрацыі…

Нам у свой час трэба было, відаць, патлумачыць правільнасць ходу рэстаўрацыі, давесці ўсім, што тая, да прыкладу, усходняя галерэя, па выніках даследавання, не мае падмуркаў і ў любы момант можа "скласціся" на людзей. Таму ў свой час было прынята рашэнне разабраць галерэю па цаглінцы і "перастварыць" яе з запасам трываласці. Паўтаруся, гэтыя захады эксперты ацанілі высока.

Потым прыязджалі спецыялісты, што цікавіліся нясвіжскім мостам, — таксама адобрылі нашу пазіцыю. Справа ў тым, што замкавы мост мы адрэстаўравалі таксама з запасам трываласці. Ён цяпер вытрымлівае аўтамабіль грузападымальнасцю звыш 11 тон — гэта вага пажарнай машыны з ёмістасцю, запоўненай вадой.

А на мінулым тыдні ў Нясвіжы працавалі эксперты з Польшчы. Яны таксама далі высокую ацэнку рэстаўрацыйным работам і засталіся ўражаныя іх тэмпамі і выкананымі аб'ёмамі…

Натуральна, працы яшчэ хапае. Мы цяпер шукаем спонсарскія грошы, каб крыху перарабіць галоўную гадзіннікавую вежу. Такім чынам, выпраўляем пэўныя недакладнасці ў рабоце папярэднікаў, якія, напэўна, таксама мелі ў свой час рацыю, бо тады немагчыма было пры дапамозе камп'ютарнай графікі аднавіць са старадаўніх гравюр найдрабнейшыя элементы вежы і дакладна ўзнавіць яе колішняе гістарычнае аблічча.

— Сярод гісторыка-культурных каштоўнасцей у 2005 годзе адноўлены і палац Паскевічаў у Гомелі…

— … І ў 2007 годзе палац Пацёмкіна ў Крычаве, былыя саляныя склады ў Віцебску (у гэтых будынках дзейнічае сёння Гарадскі цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў), адрэстаўраваны фрэскі ў Кафедральным саборы сталіцы.

Апрача гэтага ў 2006-м зроблена прыбудова да Нацыянальнага мастацкага музея, у 2007 годзе — рэканструкцыя інтэрната Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, здадзена пажарнае дэпо ў Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту. Зноў згадаю Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, рэстаўрацыю якога завяршылі пазалетась і які стаў нашым нацыянальным гонарам.

Цяпер займаемся рэканструкцыяй часткі будынка на вуліцы Фрунзэ, 19 пад размяшчэнне Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, будаўніцтвам Мінскага дзяржаўнага мастацкага вучылішча імя Глебава. Апошні аб'ект — гэта зусім новы будынак, прыстасаваны пад самыя розныя патрэбы сучасных мастакоў. Узводзіцца спартыўна-культурны цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

— Напэўна, пад асаблівым кантролем Міністэрства культуры краіны знаходзіцца рэканструкцыя "Беларусьфільма" і будаўніцтва яго новых тэхналагічных аб'ектаў?

— Безумоўна, так. Гэта шэсць аб'ектаў: узвядзенне новага інжынернага корпуса і дзвюх аўтабаз, рэканструкцыя інтэрната, старога вытворчага корпуса, праектаванне залы Тэатра-студыі кінаакцёра. Кожны аб'ект — сам па сабе немалы, а ў цэлым праграма — адна з маштабных. Пасля яе рэалізацыі, трэба спадзявацца, нашы кінематаграфісты будуць проста абавязаны якасна адпрацоўваць укладзеныя дзяржавай сродкі.

— У перспектыве, я чуў, аднаўлення чакае і цэнтр Турава?

— Літаральна на наступным тыдні павінна прайсці нарада з кіраўніцтвам Жыткавіцкага райвыканкама, з прадстаўнікамі Акадэміі навук па абмеркаванні праблемы рэканструкцыі Тураўскага гістарычнага цэнтра.

Запланавана і паездка ў Пінск, дзе адбудзецца выязное пасяджэнне навукова-метадычнай рады па варыянтах рэканструкцыі гарадскога гістарычнага цэнтра. А днямі будуць разглядацца аналагічныя пытанні па Мазыры.

— Апошняе пытанне, Віктар Іосіфавіч, што задавалі ўсім удзельнікам "круглага стала": якім бачыцца наступнае 20-годдзе ў развіцці нацыянальнай культуры?

— Перакананы, наступным пакаленням, што прыйдуць у сферу культуры, іх папярэднікі здолелі падрыхтаваць тую "кропку апоры", з дапамогай якой можна "свет перакуліць". Маю на ўвазе і матэрыяльна-тэхнічную базу, і высокае выканальніцкае мастацтва нашых артыстаў. Склалася трывалая навукова-педагагічная школа ў мастацкай і музычнай адукацыі. Школа — неперарыўная: ДШМ, сярэднеспецыяльная ўстанова, ВНУ… Да ўсяго, Міністэрства культуры прадумвае сістэму стажыровак, майстар-класаў… Словам, нам ёсць ад чаго адштурхоўвацца. А будучыня — за развіццём інфармацыйных тэхналогій. Будзе, неаспрэчна, развівацца і тэатральнае мастацтва, якое, не забываючыся на класічную драматургію, заўжды будзе адгукацца і на актуальныя праблемы сучаснага жыцця… Культура — не выспа адхлання і забыцця, а заўжды жывая крыніца, адкуль і бярэ вытокі духоўная плынь жыцця.

Гутарыў Яўген РАГІН
Фота Юрыя ІВАНОВА

СУВЕРЭНІТЭТ, ТВОРЦА, ПЕРСПЕКТЫВЫ

"Круглы стол" "К"

Незалежная Бацькаўшчына: тэндэнцыі за дваццаць гадоў, праекты на наступныя дваццаць

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 3 — 5.)

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Я мару, каб Мінск "дагнаў" іншыя еўрапейскія сталіцы па колькасці мастацкіх галерэй, каб праз дваццаць гадоў іх было не менш за сто. Гэтая лічба сёння падаецца нам фантастычнай. Але ж для еўрапейскага горада памерам з наш такая велічыня — цалкам нармальная.

Ілья СВІРЫН:

— Канкурэнцыі не баіцеся? І ці будзе, што выстаўляць у тых ста галерэях?

Дзяніс БАРСУКОЎ:

— Канкурэнцыі не баюся, бо яна толькі стымулюе творчасць. Што да напаўнення галерэй — тут нават і пытання не ўзнікае: на Беларусі жыве мноства цікавых аўтараў, якія могуць сябе праявіць куды больш паўнавартасна, чым робяць гэта цяпер. Але ж для гэтага, на жаль, пакуль што не хапае выставачных плошчаў.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Мушу звярнуць увагу і яшчэ на адну тэндэнцыю, якая праз дваццаць гадоў ужо павінна прынесці належныя вынікі: дэцэнтралізацыя культурнага жыцця. Вельмі значныя для ўсёй нашай культуры імпрэзы сёння праходзяць у маленькіх гарадках. Урэшце, згадайма хаця б тыя ж аграгарадкі з іх філарманічнымі пляцоўкамі… Беларусь здавён была слаўная мноствам культурных цэнтраў, раскіданых па ўсёй краіне, бы зоркі па небе.

Яўген РАГІН:

— І гэта таксама тэндэнцыя, што наноў актуалізавалася менавіта ў гады Незалежнасці Радзімы. Той жа Віцебск, што стаў сапраўднай культурнай сталіцай у кантэксце "Славянскага базару…", шагалаўскіх мясцін. Маладзечна, дзе сёлета праводзяцца чарговыя, ужо традыцыйныя, "Дажынкі", зіхаціць на карце значных падзей дыяментам фестывалю беларускай песні і паэзіі. Гродна ўражвае Рэспубліканскім фестывалем нацыянальных культур. А колькасць форумаў, што ладзяцца ў малых гарадах Беларусі Нацыянальным акадэмічным канцэртным аркестрам краіны пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга, даўно ўжо перасягнула рубікон у сотню з добрым гакам. І кожны з тых фестываляў — традыцыя, чаканая падзея ў тым ці іншым кутку Беларусі. А яшчэ — няспынныя адкрыцці новых і адраджэнне забытых імёнаў кампазітараў, іх твораў.

Ілья СВІРЫН:

— Толькі ў гады Незалежнасці з'явілася і яшчэ адно традыцыйнае свята — Дзень беларускага пісьменства, што сёлета адбудзецца на Ганцавіччыне. Геаграфія гэтага форуму — таксама немалая. І як не прыгадаць тут падзеі ў сёлетняй Культурнай сталіцы Беларусі — Гомелі. Праграма акцыі, што распачалася летась у Полацку, сапраўды ўражвае!

Можна адзначыць і яшчэ адну сапраўды цудоўную тэндэнцыю: у многіх гарадках ды вёсках з'яўляюцца патрыёты сваёй малой радзімы, апантаныя не якімісьці абстрактнымі ідэямі, а менавіта канкрэтнымі праектамі...

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Але падобны энтузіязм патрабуе ўсеагульнай дапамогі — у тым ліку і на ўзроўні мясцовых улад. Мне падаецца, у кожным раёне павінна быць свая праграма адраджэння спадчыны, распісаная на гады наперад.

Ігар КУЗНЯЦОЎ:

— Я хацеў бы, каб у самы бліжэйшы час мы больш сістэмна пачалі працаваць якраз-такі па захаванні нашай аўтэнтыкі. Мы губляем яе носьбітаў, тых бабуль, якія памятаюць песні нашых продкаў. Сакрэты традыцыйнага рамесніцтва, вы ведаеце, у нас захоўваюцца і дбайна перадаюцца маладым майстрам. Думаю, ёсць усе падставы, каб і фальклор захаваць. Існуюць школы рамесніцтва, дык чаму б не стварыць школы фальклору?

Уладзімір ПРАКАПЦОЎ:

— Апошнюю прапанову я падтрымліваю абедзвюма рукамі! Бо з'яўленне такіх праграм зробіць справу адраджэння спадчыны куды больш мэтанакіраванай. А сёння бывае наступным чынам: старшыня таго або іншага райвыканкама шануе гісторыю, разумее важнасць спадчыны і таму распачынае добрую справу. Але праз колькі гадоў ён ідзе на павышэнне, а яго наступнік да спадчыны ставіцца зусім інакш. Пачатая справа гібее, і высілкі аказваюцца марнымі. А калі мясцовыя ўлады будуць трымаць справаздачу і за тое, што яны зрабілі для захавання спадчыны... Вось тады будзе і плён. Калі цягам дзесяці гадоў ні ў каго не знайшлося пару гадзін часу, каб падкласці на дах шыкоўнага палаца дзве шыферыны, і гэта прывяло да страты помніка, вінаватыя павінны быць прыцягнуты да адказнасці.

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Я згадала адну вельмі важную дату: 22 чэрвеня 1941-га. Маё пакаленне гадавалася не толькі на казках, але і на расповедах бацькоў-франтавікоў. І я пыталася ў свайго бацькі: як можна патлумачыць тую самаахвярнасць яго пакалення? Зусім маладзенькім хлапчуком ён добраахвотнікам пайшоў на фронт, і вайна змяніла ўсё ягонае жыццё. Я пыталася: слухай, ты ж мог унікнуць перадавой, адсядзецца дзесьці ў тыле... І ведаеце, што ён мне адказаў? "У мяне было адчуванне, што калі я не пайду на вайну, мы яе прайграем...". Калісьці вельмі даўно я згадала гэтыя словы. Тады я толькі пачынала сваю даследчыцкую дзейнасць у галіне гісторыі беларускай музыкі. У мяне пыталіся: навошта вам траціць столькі свайго часу, навошта рабіць копіі забытых твораў за ўласныя грошы? Вядома, параўноўваць тыя дзве ступені ахвярнасці, бадай, немагчыма, аднак...

Ілья СВІРЫН:

— А ці ўласцівы гэты падыход сучасніку?

Іван ПЯЧЫНСКІ:

— Распавяду адзін выпадак, які добра ўрэзаўся мне ў памяць. Калі мы яшчэ толькі распачыналі работы на замку, усё выглядала досыць сумна: поўная смецця руіна вежы і куча старых пнёў, якія панарасталі там яшчэ ў час Першай сусветнай. Неяк трэба было іх выкарчоўваць. І вось сцэна: крохкая дзяўчына-валанцёрка абкопвае велізарны пень маленькім масцярком. Падыходзіць тагачасны старшыня сельсавета, здзіўлена глядзіць на яе і пытаецца: "Навошта ты гэта робіш?" Яна зірнула на яго і кажа: "Так трэба!" А пнёў гэтых мы выкапалі недзе пад 60 штук!..

Многія кажуць: вось, маўляў, цяперашняя моладзь безадказная, неадукаваная... Я ўжо даўно пераканаўся, што гэта не так. Бо сярод маладога пакалення ёсць людзі, надзвычай абазнаныя і адказныя. Можа, не ўсе ведаюць пра іх існаванне, бо яны не крычаць на плошчах: "Гэй, паглядзіце на нас!". Але сваю справу — робяць. У Любчанскім замку адпрацавала ўжо каля 900 валанцёраў! Вось і адказ на ваша пытанне.

Гэта цяпер мы можам забяспечыць валанцёрам сякія-такія ўмовы. А раней... Уяўляеце: дождж, а схавацца няма куды! Перачакаем яго пад аркай у брамнай вежы, якая пакуль працякае, — і далей працаваць. Гэта сёння ўжо цяжка паверыць, што замкавая вежа калісьці стаяла без даху. І дарэчы... Шмат у якіх праблемных помніках спадчыны дах усё ж захаваўся. Можа, ён ужо і працякае трошкі, але... Няўжо складана падкласці ў тое месца які ліст шыферу, каб будынак не руйнаваўся?

Вольга ДАДЗІЁМАВА:

— Я жадаю сабе і ўсім нам, каб у кожнага грамадзяніна (і асабліва — сярод дзеячаў культуры) з'явілася такое адчуванне: калі не я, дык не здзейсніцца тое, што павінна здзейсніцца. Каб праз дваццаць гадоў адчуванне асабістай адказнасці за лёс краіны было яшчэ мацнейшае, чым сёння.

Фота Юрыя ІВАНОВА

Турысты дзень пры дні наведваюць Нясвіжскі палац Радзівілаў, адкрываючы ўсё новыя і новыя здзяйсненні рэстаўратараў. А той, хто пабываў там з інтэрвалам хаця б у пару тыдняў, нават няўзброеным вокам заўважыць неверагодныя змены.
І хоць рэстаўрацыя працягваецца, палац Радзівілаў "абрастае" новымі легендамі. Сярод іх — летні open-air класічнай музыкі.

"...Паляванне" ў Нясвіжы

Музыка паводле законаў фізікі

Летні оперны фэст — ідэя цудоўная. Асабліва калі гэтаму спрыяюць акустычныя ўмовы. Сёлета ў Нясвіжы, ва ўнутраным дворыку палаца, дзе ўжо другі год запар выступалі артысты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, стала канчаткова зразумела: у такіх вечароў — вялікая будучыня.

Улічыўшы мінулагодні вопыт, калі аркестр знаходзіўся паміж збудаванай сцэнай і глядзельнай "залай", сёлета зладзілі адразу дзве сцэнічныя пляцоўкі: большую — для ўласна спектакляў і канцэртных выступленняў, і меншую, крыху збоку, — для аркестра. Але ў час рэпетыцыі артысты і дырыжор Вячаслаў Воліч хутка прызвычаіліся да новых умоў. Па-новаму пачувалі сябе і гледачы, бо чым далей ад сцэны, тым больш моцным і насычаным было гучанне. Няўжо законы фізікі хтосьці ўзяў ды адмяніў? Ажно не! Менавіта па тых самых законах акурат гэткі эфект даюць каменныя збудаванні, замкнёныя ў кола. Гук не паглынаецца ні драпіроўкай, ні іншымі тэатральнымі прыладамі, адштурхваецца ад сцен і застаецца ўнутры. Чым не ідэальныя ўмовы?

Дубатоўк — Аляксандр Кеда.

Дый натуральныя дэкарацыі старадаўняга палаца аказаліся да месца, тым больш — у оперы Уладзіміра Солтана "Дзікае паляванне караля Стаха": гледачы быццам пачувалі сябе сапраўднымі сведкамі сучасна-гістарычнага дэтэктыва. Ва ўмовах сціснутай прасторы (сцэна ў нашым тэатры куды большая па памерах) і змяшчэння ў ёй далёка не ўсіх дэталей інтэр'ера ад колішняй рэжысуры Вячаслава Цюпы (1989 год, як-ніяк!) нічога, бадай, не засталося. А вось музыка заззяла новымі фарбамі.

Ледзь не ўпершыню можна было пачуць у гэтай оперы цудоўную дыкцыю. І ўзрадавацца не толькі добраму беларускамоўнаму маўленню, але і добра складзенаму лібрэта Святланы Клімковіч. Можна толькі здагадвацца, як няпроста было ператварыць у сціслыя оперныя радкі ўсю бяздонную глыбіню караткевічаўскай прозы. Але ж наколькі актуальна гучаць сёння, напярэдадні Дня Незалежнасці, узрушаныя, напоеныя цудоўнай мелодыяй словы пра Беларусь і любоў да радзімы!

З'явіліся і новыя акустычныя спецэфекты: "дзікае паляванне" з яго гукамі старадаўніх сурмаў даносілася не з-за сцэны, а з расчыненых вокнаў той часткі палаца, дзе яшчэ працягваецца рэканструкцыя. Можа, здані і сапраўды ажылі? Бо адчуванне было — мароз па скуры. Нават не ад полымя відэапраекцыі, што вар'явалася ў фінале на супрацьлеглай сцяне палаца, а ад самой музыкі і яе аркестравых фарбаў, дзе на адным полюсе — мелодыя вальса ў гучанні казачнага гадзінніка, што адлічвае імгненні вечнасці, на другім — тая ж тэма ў цяжкім поступе няўмольнай чорнай навалы, а над усім — яна ж у лірычным разгорце ўзнёслых пачуццяў.

Уладзімір Громаў і Алена Бундзелева.

Алег Яромкін і Кацярына Алейнік.

І гэта толькі адзін фрагмент нясвіжскіх дзівосаў! Былі ж яшчэ і два запар "Вяртанні раманса", калі Таццяна Трацяк і Станіслаў Трыфанаў спявалі ў гарадской Ратушы пад струнны квінтэт. Была і прэм'ера араторыі "Жальбы" Ігара Хадоскі, бацькі "раскручанага" кампазітара Алега Хадоскі, у Фарным касцёле. Адметнасць гэтага твора ў тым, што ў аснову яго былі пакладзены мелодыі XVII — XVIII стагоддзяў, якімі ў касцёлах ад Любліна да Яраслаўля (а менавіта там шукалі і знаходзілі пакладзеныя ў аснову твора музычныя матэрыялы) аплакваліся пакуты Хрыста. Жалобныя галашэнні былі выдадзены ў Польшчы пад назвай "Планкты". Іх асобныя нумары гучалі і ў нас, у тым ліку — у апрацоўцы для салістаў і ансамбля "Класік-Авангард". Нарэшце, Ігар Хадоска прапанаваў свой погляд на эпоху барока, аздобіўшы яе некаторымі прыкметамі музычнай сучаснасці.

Як і летась, была ў Нясвіжы і балетная класіка, і фінальны гала-канцэрт. І — ніводнага вольнага месца! Білеты ад 7 да 20 тысяч рублёў набываліся і мінчанамі, якія дзеля тых імпрэз ехалі ў Нясвіж, і, пераважна, мясцовымі жыхарамі. Застаецца спадзявацца, што праз нейкі час на палацавана-нясвіжскія оперна-балетныя баляванні-паляванні будуць гэтак жа збірацца і замежнікі, прываблены магчымасцю далучыцца адразу да ўсяго: да радзівілаўскіх мясцін, нашай культурнай спадчыны ды сучаснасці.

Юрый Гарадзецкі.

Сапраўды, не адно ж ім нашых артыстаў у сябе ў замежжы слухаць! Акурат у апошні дзень нясвіжскага свята ў Кёльне адбыўся фінальны канцэрт працяглых двухмесячных гастролей аркестра нашага тэатра з нямецкай спявачкай і артысткай Хеленай Фішэр па гарадах Германіі, Даніі, Швейцарыі. Для ўдзелу ў гэтым турнэ дырыжор і імпрэсарыа Вільгейльм Кайтэль адабраў каля 40 беларускіх музыкантаў — самых маладых ды прыгожых. Бо яны не толькі акампаніравалі салістцы, якая спявала ды танчыла, а яшчэ і станавіліся паўнавартаснымі ўдзельнікамі шоу. Крытыкі параўналі наш "маладзёжны оперны аркестр" з Берлінскім сімфанічным. А публіка сустракала іх кожны выхад кветкамі і авацыямі.

Вярнуўшыся дадому (хто — з Нясвіжа, хто — з Германіі), артысты пайшлі ў адпачынак. Але хутка зноў збяруцца на рэпетыцыі! Бо 79-ы сезон распачнецца 1 верасня. А 9-га тэатральны бамонд збярэцца на прэм'еру сезона — новую пастаноўку "Севільскага цырульніка".

Фота Міхаіла НЕСЦЕРАВА

“Талаш” у вялікім кіно

Як “пралічыць” гістарычны фільм і нацыянальнага героя?

З рэжысёрам Сяргеем ШУЛЬГОЙ карэспандэнт “К” сустрэўся ў самы гарачы момант: яго чатырохсерыйная тэлевізійная стужка “Талаш” па вядомай кожнаму беларусу аповесці Якуба Коласа “Дрыгва” рыхтавалася да здачы экспертнаму савету Міністэрства культуры.

Рэжысёр Сяргей Шульга (другі справа) пад час пастаноўкі эпізода.

— Сцэнарый стужкі быў напісаны ў разліку на шэсць серый, — тлумачыць Сяргей Мікалаевіч. — Але патрабаванні сучаснага тэлевізійнага фармату прымушаюць нас зрабіць толькі чатыры часткі па пяцьдзясят дзве хвіліны. Шмат цікавага матэрыялу засталося, на жаль, па-за межамі рабочага варыянту. Скажу адно: мы паспрабавалі пакінуць самае цікавае. Дасягнуць гэтага было досыць няпроста. Мы разумелі ўсю сур’ёзнасць тэмы аповесці “Дрыгва”, якая закранае адносіны паміж народамі. Але, адразу падкрэслю, мы рабілі не гістарычнае кіно, не дакладную рэканструкцыю падзей дзевяностагадовай даўніны, а стужку пра патрыётаў, якія абараняюць сваю Радзіму.

— Як вам працавалася з прозай Якуба Коласа? Вядома, што калі класік беларускага кіно Уладзімір Корш-Саблін здымаў сваю эпапею па трылогіі “На ростанях”, то пераклад коласаўскіх радкоў на “кінамову” адбываўся з вялікімі цяжкасцямі...

— Маё жыццё склалася так, што я ўвесь час быў знітаваны з Якубам Коласам: акцёрская кар’ера праходзіла ў віцебскім тэатры, які носіць імя класіка, куды мяне запрасілі на роль Сымона Музыкі, першая рэжысёрская работа на сцэне была створана па творы Коласа і называлася “Анамалія”, я добра знаёмы з Музеем Песняра і яго супрацоўнікамі... Я не сказаў бы, што проза Коласа ўвогуле не паддаецца экранізацыі, але, што да “Талаша”, то мне як сцэнарысту стужкі давялося шмат папрацаваць над яе сюжэтам. Усё-такі аповесць “Дрыгва” стваралася ў 1934 годзе, у зусім іншых рэаліях. Тым не менш, у сваім творы Колас выбудоўвае дакладную драматургічную лінію, таму не магу сказаць, што стварацъ сцэнарый было вельмі цяжка.

А ў кадры ж гучаць адразу тры мовы: беларуская, руская і польская. Гэта цалкам адпавядае той сітуацыі, якая склалася на Беларусі ў часы, калі жылі нашы героі. Але, што вельмі істотна, “Талаш” — першы за шмат гадоў твор, зняты на Нацыянальнай студыі на беларускай мове. Што да польскай, то пераклад словаў персанажаў, якія на ёй размаўляюць, агучыў акцёр Валерый Шушкевіч. Ён жа чытае тэкст ад аўтара.

— А як жа нядаўняя “Масакра” Андрэя Кудзіненкі?

— “Масакра” — стужка зусім іншага жанру: фактычна гэта казка, якая, з невялікімі папраўкамі, можа мець месца ў любой іншай краіне. Што ж да “Талаша”, то гэтая гісторыя — тыпова наша, яе дзейныя асобы — менавіта беларусы.

— Наколькі разумею, гістарычны жанр — ці не самы складаны ў кінематографе. Пастаноўшчыкам трэба, у тым ліку, аднавіць пэўны культурны слой: тое, як людзі апраналіся, на чым ездзілі, як размаўлялі...

— “Талаш” быў складаны не толькі з гэтай прычыны, хоць, безумоўна, такіх “матэрыяльных” пытанняў, як гістарычная вопратка і транспарт, хапала. Калі з вопраткай сялян і партызанаў вялікіх праблем не было, то над воблікам іншых персанажаў давялося папрацаваць. Уявіце сабе, у стужцы — некалькі арыстакратычных прыёмаў, баляў! А яе бюджэт не дазваляў пашыць адмысловыя касцюмы, таму давялося падбіраць з гатовага, што было вельмі складана і за што асобнае дзякуй нашым касцюмерам. Тое ж самае тычыцца іграваога транспарту: князь не будзе перасоўвацца на сялянскім возе... Да таго ж, вялікі кавалак працы быў прысвечаны гуку: карціна была напалову знята ў павільёнах, але нам давялося цалкам пераагучваць яе, — такое не часта бывае на здымках тэлевізійнага кіно, дзе звычайна больш нізкія стандарты якасці. А мы стараліся ставіцца да “Талаша” як да сапраўднага “вялікага” кіно. Калі бярэшся здымаць на гістарычную тэму, трэба вельмі добра “пралічваць” наяўныя рэсурсы: гістарычнае кіно — справа дарагая ва ўсіх сэнсах.

— І, тым не менш, за яе ўвесь час бяруцца ўсё новыя і новыя аўтары...

— Таму што гістарычныя падзеі даюць вялікую магчымасць назіраць за асобай, грамадствам, дзяржавай у найбольш цікавыя моманты іх існавання, калі на зломе эпох глыбей праяўляліся характары. Асабіста я люблю гісторыю, люблю фільмы пра вайну. Мае першыя стужкі былі менавіта пра Вялікую Айчынную. З гэтым звязана асабістае: мой бацька ваяваў, партызаніў.

Абудзіць свядомасць

— Якім чынам нараджаўся вобраз нацыянальнага героя?

— Хачу падкрэсліць, што наш Талаш — вобраз мастацкі, ён амаль не мае дачынення да канкрэтнай гістарычнай асобы. Гэта абагульнены вобраз народнага мсціўцы, партызана, які быў актуальны не толькі ў 1919 годзе і не толькі на Палессі. Як і Чапаеў братоў Васільевых не быў “злепкам” рэальнага чалавека, так і наш Талаш увасабляе ў сабе рысы ўсіх барацьбітоў за свабоду нацыі.

— Мы прывыклі асацыіраваць акцёра Генадзя Гарбука з вобразамі сялян, а ўзорам такога тыпажу з’яўляецца яго Пятрок са “Знака бяды” Міхаіла Пташука. З вашых слоў можна зразумець, што Талаш — поўная супрацьлегласць...

— Я вельмі цаню Генадзя Міхайлавіча за яго неверагодную магчымасць змяняцца па патрабаванні рэжысёра. Сапраўды, і на экране, і на сцэне мы бачым яго часцей за ўсё ў ролях мяккіх, нібыта бязвольных персанажаў. З самага пачатку працы над “Талашом” ён спрабаваў выбудоўваць вобраз свайго героя па звыклай схеме, але мы адразу дамовіліся, што наш Талаш — менавіта герой, лідар, з пэўнай доляй “простага” вяскоўца, які мог прапанаваць паставіць сабе самому конную статую ў цэнтры Масквы...

— Дык, на вашу думку, які вобраз больш характэрны для беларуса: барацьбіта-Талаша ці больш памяркоўнага абывацеля?

Генадзь Гарбук у ролі Талаша.

— Калі паглядзець на прозу нашага класіка Васіля Быкава, то лідараў у яго ных раманах няма, а ёсць людзі, якія становяцца героямі дзякуючы акалічнасцям лёсу. Іншы класік, Уладзімір Караткевіч, наадварот, прапануе нам шэраг энергічных, заклапочаных лёсам сваёй краіны асоб. З іншага боку, Васіль Уладзіміравіч, селянін па паходжанні, быў бліжэй да глебы... Мы паспрабавалі “стварыць” гераічны характар.

Выйсці на сваю аўдыторыю

— Праект “Талаш” цікавы яшчэ і тым, што ў ім заняты толькі беларускія акцёры — у найноўшай гісторыі “Беларусьфільма” гэта, бадай, унікальны выпадак...

— Так. Я сам пачынаў кар’еру як акцёр і ведаю, наколькі важна, каб цябе цанілі менавіта на радзіме. На здымках “Талаша” я зрабіў шэраг акцёрскіх адкрыццяў. Лічу, што ў нашых акцёраў папросту няма магчымасці раскрыцца напоўніцу ў тэатры, таму іх як мага больш трэба задзейнічаць у кіно, каб іх бачыла ўся Беларусь і замежжа. Я люблю нашых акцёраў, сярод іх шмат такіх, якія па сваім майстэрстве знаходзяцца на ўзроўні “медыйных” тэлезорак. Калі глядач ацэніць іх працу ў “Талашы”, я буду шчаслівы, буду лічыць гэта сапраўдным прарывам айчыннага акцёра да сваёй аўдыторыі.

— Ці можна агучыць некалькі прозвішчаў?

— З задавальненнем! Павел Харланчук шмат здымаецца апошнім часам, але ў нас ён дэманструе новыя грані свайго таленту. Ён выдатна ўвасабляе Сцяпана Бусыгу — персанажа адмоўнага, малочнага брата князя Длугошыка, які з-за свайго паходжання не можа далучыцца ні да сялян, ні да арыстакратыі. Мяркую, сапраўднай з’явай стане іграа актрысы Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі Настасі Бабровай, якая ўвасобіла Аўгінню. Калі ішло абмеркаванне рабочага матэрыялу, Генадзь Іванавіч Палока, мастацкі кіраўнік праекта, падняўся і сказаў пра яе ігру: “На нашых вачах адбылося нараджэнне актрысы еўрапейскага ўзроўню”. Цудоўныя Дзяніс Паршын, які выконвае трэцюю па значнасці ролю, Анатоль Голуб, Андрэй Сенькін, Алена Дуброўская. Віталь Краўчанка для свайго вобраза Збігнева наведваў курсы польскай мовы і ў выніку дамогся вельмі добрага вымаўлення. Удаліся нават эпізадычныя акцёрскія работы... Карацей, я надзвычай задаволены акцёрскім складам! Між тым, здымкі праходзілі ў няпростых умовах надвор’я, былі складаныя моманты з забеспячэннем. Але нашы цудоўныя артысты пераадолелі ўсе “выпрабаванні” і паказалі годны вынік.

Дзяніс Паршын і Настасся Баброва на здымачнай пляцоўцы “Талаша”.

— Як будаваліся вашы адносіны з акцёрамі на пляцоўцы?

— Верагодна, адчуваючы маё акцёрскае мінулае, яны ўвесь час “даставалі” мяне сваімі прапановамі, намагаліся зрабіць свае вобразы больш дасканалымі, і я з задавальненнем прымаў такую форму сутворчасці.

— Умовы сучаснай вытворчасці стужак для тэлебачання звычайна амаль не пакідаюць часу для прапрацоўкі вобразаў і асобных эпізодаў...

— Таму я і пагадзіўся працаваць на праекце, які здымаюць за дзяржаўныя сродкі. На камерцыйных — зусім іншыя размовы: там амаль прымусовае патрабаванне зняць “сем хвілін за змену” і практычна няма часу для творчасці. Канешне, сказаць, што нам хапіла часу на ўсё задуманае, я не магу. Але тыя тэлевізійныя “прадзюсарскія” праекты, якія здымаюцца адно ў камерцыйных мэтах, наогул не ставяць перад сабой мастацкія задачы. Памятаю, як толькі скончыў ВГИК і прыйшоў на студыю. Гэта былі зусім іншыя часы, калі на першым плане стаялі мастацкія, а не камерцыйныя задачы. Таму ўся студыя тады перажывала за кожную стужку як за агульную работу. І калі нешта ў кагосьці не атрымлівалася, то ўсе разам дапамагалі ліквідаваць праблему. Цяпер такога няма, і людзі імкнуцца найперш на камерцыйныя праекты. Таму я быў вельмі ўзрадаваны, убачыўшы, з якім натхненнем працавала ўся здымачная група на “Талашы”, а асабліва — акцёры. Мы прапанавалі па-сапраўднаму цікавую працу, і людзі, як мне падаецца, гэта ацанілі.

— На вашу думку, якім павінен быць генеральны кірунак нашага нацыянальнага кіно?

— Ведаеце, мы не можам канкурыраваць з Галівудам у сферы спецэфектаў. Мы можам “узяць” гледача толькі дэманстрацыяй унутранага свету чалавека, хараством душэўнай прыгажосці беларускага народа. Больш цярплівай нацыі, чым беларусы, у тым ліку і ў дасягненні задуманага, я не ведаю. І гэтым можна толькі ганарыцца.

Гутарыў Антон СІДАРЭНКА
Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

“Выстаўка чатырох”

Настальгія па мінулым?

Выстаўка, якая працуе ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі, называецца “Класіка графікі” і, як сказана ў прэс-рэлізе, прысвячаецца “класічнаму” перыяду беларускай графікі 1960-х — 1970-х гадоў. На мой погляд, назва яе — не вельмі дакладная (“класіка” — ад лац. “classicus” — “узорны”), бо большасць твораў экспазіцыі ўсё ж належаць уласна свайму часу і ўяўляюць цікавасць як “выяўленчыя дакументы” менавіта тых гадоў, у якія жылі аўтары.

В.Ткачук. “Цярэспальскія вароты”.

Р.Клікушын. “Віцебск”.

А тое, што яны працавалі “ў класічных графічных жанрах і тэхніках”, усё ж не перадае сутнасці: у гэтых тэхніках і жанрах (лінарыт, літаграфія, малюнак, акварэль, змяшаная тэхніка; пейзаж, партрэт, фігуратыўная кампазіцыя, ілюстрацыя) паспяхова тварылі і да, і пасля прадстаўленых аўтараў. Ды і сучасны глядач, на жаль, вельмі мала ведае іхнія імёны, бо іх работы на выстаўках апошніх гадоў амаль не экспануюцца.

Так, чацвёра мастакоў, юбіляраў 2011-га, якія нарадзіліся ў 20-я гады: Міхаіл Бельскі, Васіль Ткачук — ужо, на жаль, нябожчыкі, — Рыгор Клікушын ды Юрый Выхадцаў, дзякаваць богу, і сёння паспяхова служаць любімай справе — мастацтву.

Па гэтай “выстаўцы чатырох” я хадзіў, як старацель па прыіску. Радасна вітаў алоўкавы і акварэльны пейзажы Юрыя Выхадцава, якіх я раней не бачыў. Пазнаваў “старых знаёмых” — Міхаіла Бельскага і Васіля Ткачука, каго я асабіста добра ведаў і неаднойчы бываў у іхніх майстэрнях. А калі ўбачыў віцебскія пейзажы Рыгора Клікушына, які, дарэчы, напрыканцы 2011-га адзначыць сваё 90-годдзе, узгадаў яго ўнікальную шрыфтавую графіку і даўнія цікавыя серыі пра беларускую вёску і любімы Віцебск. А яшчэ ён быў выдатным педагогам, і, па словах скульптара Аляксандра Гвоздзікава, “…усе віцебскія мастакі выйшлі з графікі Клікушына, як калісьці літаратары — з “Шыняля” Гогаля”. Праўда, у сённяшняй экспазіцыі ён прадстаўлены надта сціпла: усяго некалькі работ. Урэшце, і Міхаіл Бельскі паказаны, на маю думку, не лепшым чынам (у яго спадчыне ёсць вельмі ўдалыя графічныя серыі “Мая Беларусь”, “Мой родны кут”, “дакументальныя” літаграфіі пра рэвалюцыю, хаця тое цікава, хутчэй, для гісторыка. Аднак выстаўленыя партрэты “лепшых прадстаўнікоў рабочага класа” характэрныя для яго почырку. Я памятаю, з якім задавальненнем прыходзілі да яго ў майстэрню па вуліцы Някрасава людзі, каб папазіраваць гэтаму гаваркому мастаку, што любіў бываць, як кажуць, у гушчы жыцця: на заводах, фабрыках, аўтобусных прыпынках, сярод студэнтаў (сам ён быў добрым настаўнікам у Політэхнічным інстытуце), і ў кожнай “мадэлі”, незалежна ад яе прафесіі і звання, імкнуўся знайсці натхнёнае ўнутранае святло...

Творы Васіля Ткачука вылучаюцца, так бы мовіць, “тэматычнай” сціпласцю і невялічкай шкалой выкарыстаных мастакоўскіх сродкаў. Але ён і ў сваіх “індустрыяльных” сюжэтах, і ў эстампе (лінарыт і літаграфія) выпрацоўваў індывідуальны стыль, які найбольш ярка праявіўся менавіта ў “рэпартажнай” графіцы, дзе творца імкнуўся пазбегнуць жорсткай чарцёжнасці і сухасці “індустрыяльных вобразаў”, так шырока распаўсюджаных у работах многіх мастакоў тых гадоў. Хаця, я памятаю, Васіль Мітрафанавіч вельмі любіў рысаваць лірычныя зімовыя і вясновыя пейзажы, а таксама “вобразы” Мінска...

Людзі па-рознаму ўваходзяць у прыроду. Можна ўвайсці ў яе, як японцы ўваходзяць у чайны дамок, пакінуўшы абутак і клопаты ля парога. Сустрэліся чалавек і прырода, і няма ў іх карыслівасці: у прыроды — прыгнятаць чалавека, у чалавека — украсці ў яе што-небудзь... Яны размаўляюць… Гэта ўсё — пра Юрыя Выхадцава, творы якога ў экспазіцыі прадстаўлены вельмі дастойна. Па сутнасці, наколькі ведаю, гэта яго другая, пасля 1987 г., “персанальная” выстаўка, так бы мовіць, у рамках “чатырох”. Наконт гэтага хачу прывесці словы Георгія Паплаўскага: “Нарэшце адбылося адкрыццё для грамадскасці” цудоўнага майстра графікі Юрыя Выхадцава. Хачу павіншаваць не толькі аўтара, але і кола тых людзей, якія садзейнічалі дадзенай падзеі”.

Цалкам далучаюся да гэтых слоў…

М.Бельскі. “Стаіць адзінокая сасна”.

Ю.Выхадцаў. “Плошча Перамогі. Першакласнікі”.

Мажорная нота, а не “мадэлі”

У.Уродніч. “На Магілёўскім напрамку”.

“Абаронцам Айчыны” — так называецца выстаўка Студыі ваенных мастакоў, што працуе ў дзвюх залах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Экспазіцыя прысвечана легендарнаму Подзвігу народа ў гады былых баёў на тэрыторыі Беларусі, жыццю сучаснай беларускай арміі і тых людзей, якія маюць непасрэднае дачыненне да абароны нашай зямлі.

С.Раманаў. З партызанскіх замалёвак.

Выстаўка, складзеная з 50 твораў жывапісу і 17 натурных партызанскіх замалёвак С.Раманава (а ўсяго ў ёй удзельнічаюць 15 творцаў), — яскравы і багаты плён творчага шляху тых, для каго патрыятызм заўсёды быў не пустым гукам, а ўнутраным пачуццём шчырай адказнасці за лёс Радзімы.

У лепшых работах такіх жывапісцаў, як М.Апіёк, У.Уродніч, У.Гардзеенка, Л.Дударэнка, Г.Лойка, П.Данэлія, Г.Паплаўскі, М.Савіцкі, адчуваецца імкненне аўтараў знайсці адпаведныя сродкі для адлюстравання гераічнага шляху нашай краіны, паказу велічы і прыгажосці яе людзей, салдат, палкаводцаў і проста радавых “рабочых вайны” ды іх слаўных нашчадкаў.

Я не скажу, што ўсе творы ўвойдуць у “залаты фонд” нашай выяўленчай культуры. Некаторыя палотны, як вызначылі б прафесіяналы, — не да канца “выпакутаваныя”, з налётам нейкай халаднаватай зададзенасці.

Але гаворка зараз не пра гэта. У мастацтве, як вядома, прамых і роўных шляхоў не бывае. Гаворка — пра тое, што ўсе гэтыя творцы (а сярод іх — і народныя мастакі, і заслужаныя дзеячы мастацтва) з'яўляюцца духоўнымі носьбітамі той Праўды быцця, якая так патрэбна нам асабліва сёння, таму што незалежная Беларусь, гераічныя старонкі яе барацьбы, яе зямля, яе працаўнікі і абаронцы — нязменная іх тэма.

Колькі звязана з кожным творам хваляванняў, упартасці, імкнення пранікнуць у самую сутнасць вобраза, характару, жыцця тых, каго ўзяўся адлюстроўваць на палатне той або іншы жывапісец! І гэта ўсё для таго, каб глядач бачыў у мастацтве не толькі і не столькі “мадэлі” творцы, а яго самога, ягоны час — непаўторны, цудоўны, трагічны і гераічны, жывы, незабыўны. Таму палітра ў многіх усё ж больш мажорная, сакавітая. Гэта і не дзіва: яна адлюстроўвае радасць жыцця, якую прынесла тая Перамога 1945-га…

У.Гардзеенка. “Безназоўная вышыня”.

Канцэрт адкрыцця — візітоўка фестывалю. Прыадкрыць заслону таямніцы мы папрасілі вядомага рэжысёра Аляксандра ВАВІЛАВА, сведку ўсіх дваццаці фэстаў. Сёлета ён выступае не толькі паплечнікам расійскага калегі — рэжысёра Мікалая Андросава з Масквы, — але і аўтарам сцэнарыя канцэрта адкрыцця.

— Штораз напярэдадні фестывалю, — распавёў Аляксандр Дзмітрыевіч, — журналісты задаюць адно і тое ж пытанне: маўляў, чым вы сёлета збіраецеся здзіўляць публіку? І прагнуць пачуць самыя зорныя імёны гасцей. Усё гэта, можа, і няблага, але ж ці ўмеем мы, насамрэч, здзіўляцца? Бо для гэтага часам трэба проста па-новаму зірнуць на тое, што здавалася звыклым. Дык вось, сёлета галоўнай "фішкай" канцэрта адкрыцця "Славянскага базару ў Віцебску" стане вакальная сюіта на песні Ігара Лучанка і Аляксандры Пахмутавай. Здавалася б, усе гэтыя песні — вядомыя, кожная за столькі гадоў знайшла ўжо свайго "ідэальнага выканаўцу". Але ж як, насамрэч, дорага, што мы робім гэтую сюіту маладымі сіламі! І, дарэчы, — адно мужчынскімі галасамі. Спяваць будуць хлопцы ва ўзросце ад 15 да 19 гадоў: пераможцы самых розных конкурсаў ды фестываляў, уключаючы рэгіянальныя. Да іх далучацца майстры — удзельнікі ансамбля "Чысты голас". Бо галоўнае на фестывалі — нават не хто з зорак прыедзе, а што мы самі на гэты форум прынясём, што будзе ў нашай уласнай "справаздачы" такога, каб запомніцца на гады.

"Чарадзейства" ў Амфітэатры

Фестываль "Славянскі базар у Віцебску" — гэта нацыянальны набытак рэспублікі, які адначасова з'яўляецца вымяральнікам і рухавіком многіх з'яў у культуры, палітыцы, грамадскім жыцці. Ён вылучае новыя імёны і творчыя калектывы, часам вяртае забытую спадчыну, а часам — наадварот, сімвалізуе канчатковы сыход кагосьці з вышэйшых прыступак мастацтва. Фестываль такога ўзроўню — гэта, калі хочаце, яшчэ і самы высокі артыстычны суд, галоўная пляцоўка для паказу таго, што было зроблена за год. На жаль, не ўсе гэта разумеюць. Здараецца, артыстамі рухае жаданне папросту "засвяціцца". Але гэта — таксама паказчык. І на сцэне "Славянскага базару..." тое становіцца яшчэ больш відавочным, чым дзе. Бо спявак выносіць да гледача не падрыхтаваную песню, не свой голас ці артыстычныя магчымасці, а ўсё сваё жыццё, увесь назапашаны чалавечы вопыт, усе свае думкі і жаданні. Ён, можа, і не ўсведамляе гэтага, але сцэна віцебскага Амфітэатра ў чымсьці "чарадзейная": пры ўсіх вялікіх памерах сцэны і залы, тут не схаваць сваю сутнасць.

Яшчэ пры сваім нараджэнні фестываль адразу вызначыўся ўласнай ідэяй: папулярызаваць мастацтва славян, якія запрашаюць да сябе прадстаўнікоў усіх народаў свету. Памятаеце, як доўга спрачаліся наконт слова "базар"? Але час даказаў, што з назвай не памыліліся: на "Славянскім базары..." месца ёсць усім — і ўсяму самаму лепшаму. Сведчаннем гэтага і стане канцэрт адкрыцця.

Н.Б.

Хітовая "карцінка"

Рэжысёр канцэрта адкрыцця "Славянскага базару ў Віцебску" Глеб ШАПО распавёў пра некаторыя дэталі сёлетняй тэлетрансляцыі. "Яна будзе не менш відовішчнай за тыя, што адбываліся ў мінулыя гады", — зазначыў ён.

— У якасці прыкладу, — адзначыў Глеб Шапо, — прывяду толькі адзін факт: здымкі ўрачыстага мерапрыемства будуць праводзіцца з дапамогай ажно чатырнаццаці тэлевізійных камер! Так што "карцінка" мерапрыемства, упэўнены, задаволіць самага патрабавальнага гледача...

На сённяшні дзень усе тэлевізійныя службы завяршаюць апошнія падрыхтоўчыя работы, і, як пабяцаў рэжысёр, усе тыя, хто не трапіў у Віцебск і будзе сачыць за фестывалем ля экранаў сваіх тэлевізараў, адчуюць сябе сапраўднымі гледачамі захапляльнага канцэрта адкрыцця "Славянскага базару ў Віцебску".

Паведаміў Глеб Шапо і пра тое, што сёлета ён з'яўляецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам Дня Беларусі, які адбудзецца наступным днём, 9 ліпеня, на пляцоўцы Летняга амфітэатра. Перад удзячнымі гледачамі выступяць Іскуі Абалян, Алеся, Іна Афанасьева, Анатоль Ярмоленка і ансамбль "Сябры", арт-група "Беларусы", гурт "DaVinci" і многія іншыя выканаўцы — усяго 22 нумары. Галоўнай ідэяй гэтага канцэрта, па словах рэжысёра, будзе экскурс у гісторыю фестывалю: артысты выканаюць у сваіх аранжыроўках хіты беларускіх аўтараў, якія гучалі на "Славянскім базары..." у ранейшыя гады. А пад час выступлення нашых артыстаў на вялікіх экранах пастаянна будзе трансліравацца архіўнае відэа.

Ю.Ч.

Што пабачым на Дваццатым?

Вялікую ролю кіраўніцтва Беларусі і асабіста Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ў падтрымцы Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" адзначылі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Тэма 20-годдзя "Славянскага базару ў Віцебску" будзе праходзіць праз усе мерапрыемствы фестывалю, падкрэсліў першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір Карачэўскі.

— Канцэрт "З юбілеем, фестываль!" аб'яднае многіх удзельнікаў Міжнароднага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні ў рамках форуму, якія выступалі і перамагалі на ім, за ўсе 20 гадоў, — дадае Уладзімір Карачэўскі. — Сёння ўжо вядома дакладная колькасць удзельнікаў конкурсу "Віцебск-2011": гэта 20 выканаўцаў з 20 краін. А журы яго ўзначаліць міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка...

Дваццаты па ліку форум не абышоўся без навінак: адной з іх стане Першы Фестываль мастацтваў беларусаў свету. Змены чакаюць таксама і галоўную пляцоўку "Славянскага..." — Летні амфітэатр, на якім адбудзецца больш за дваццаць мерапрыемстваў. Гэтым разам пад час канцэртаў канфігурацыя сцэны будзе змяняцца, тэхнічныя эксперыменты здзівяць публіку. Усяго звыш 70 мерапрыемстваў пройдуць на "Славянскім базары ў Віцебску", а некаторыя з іх выйдуць за межы фестывальных дзён: адбудуцца да і пасля форуму.

Адной з важных падзей стане закладка на Алеі лаўрэатаў спецыяльнага прыза Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення" зоркі народнага артыста СССР, народнага артыста Беларусі кампазітара Ігара Лучанка.

Па словах кіраўніка Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Сяргея Забалотца, урачыстай стане сустрэча з намінантамі на прэмію Саюзнай дзяржавы ў галіне культуры, літаратуры і мастацтва 10 ліпеня.

— На сёлетні форум з бюджэту Саюзнай дзяржавы было выдаткавана 25 мільёнаў расійскіх рублёў, — паведаміў Сяргей Забалоцец.

Генеральны дырэктар Дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" Радзівон Бас адзначыў, што юбілейны "Славянскі..." карыстаецца вельмі вялікім попытам у жыхароў Віцебска і ўсёй краіны. Было прададзена больш білетаў на канцэрты, чым у мінулыя гады, а прадстаўнікі турыстычных кампаній арганізоўваюць шмат тураў для ўсіх ахвотных.

Першы на юбілейным

Як ужо паведамляла "К", у хуткім часе ў Беларусі адбудзецца Першы Фестываль мастацтваў беларусаў свету. Яго правядзенне запланавана на 7 — 10 ліпеня бягучага года з арганізацыяй разнастайных мерапрыемстваў у горадзе над Дзвіной пад час XX Міжнароднага фестывалю мастацтваў "Славянскі базар...", а таксама ў Мінску. Фестываль ініцыяваны Міністэрствам культуры краіны і праводзіцца па рашэнні Урада Рэспублікі Беларусь.

Першы Фестываль мастацтваў беларусаў свету пакліканы шырока прэзентаваць дасягненні мастацкай творчасці нашых суайчыннікаў за мяжой і актывізаваць з імі культурнае супрацоўніцтва, падтрымаць з боку Бацькаўшчыны зацікаўленасць беларусаў замежжа ў захаванні нацыянальна-культурнай самабытнасці, беларускай культуры, традыцый і мовы.

Праграмай знакавага форуму прадугледжана арганізацыя канцэртаў беларускай фальклорнай і сучаснай музыкі, выставак жывапісу і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фотаэкспазіцый, творчых сустрэч з беларускімі пісьменнікамі і паэтамі замежжа, а таксама шэрагу іншых мерапрыемстваў. У час правядзення фестывалю ўзнагародамі Міністэрства культуры будуць адзначаны прадстаўнікі беларускіх аб'яднанняў замежжа за ўклад у захаванне, развіццё і папулярызацыю беларускай культуры і мовы ў краінах пражывання.

Таксама плануецца прымеркаваць да фестывалю правядзенне другога пасяджэння Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь для абмеркавання актуальных пытанняў супрацоўніцтва беларускай дзяржавы з суайчыннікамі за мяжой, а таксама "круглага стала" "Рэаліі і перспектывы нацыянальных меншасцей у краінах Усходняй Еўропы".

На здымку: Канцэртная зала "Віцебск" прыме гасцей форуму.

У стылі Віцебска

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь увёў у абарачэнне памятныя манеты "Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" новай серыі "Міжнародныя фестывалі ў Беларусі": сярэбраную — наміналам 10 рублёў і медна-нікелевую — наміналам 1 рубель.

Як зазначаюць упраўленні інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, новыя манеты маюць форму круга. Аверс: уверсе ў цэнтры — рэльефны відарыс Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь; у цэнтры манеты — лагатып "Славянскага базару", выкананы ў стылі дынамічнай дэкаратыўна-шрыфтавой кампазіцыі; па крузе — надпісы: уверсе — "Рэспубліка Беларусь", унізе — намінал; злева — год чаканкі.

Рэверс: у цэнтры, на фоне панарамы горада з пазнавальнымі віцебскімі архітэктурнымі вобразамі, — стылізаваная рэльефная выява рукі, працягнутай да гледача далонню ўверх. На ёй з вежай "Духаўскі круглік" на заднім плане адлюстравана галоўная сцэна "Славянскага базару..." — Амфітэатр, за ёй — нотка-валошка з пялёсткамі, якія ператвараюцца ў птушак.

Тэатралізаваная дзея, што распачынала ўжо другі па ліку "Цукеркавы фэст" у Івянцы, была вытрымана ў жанры "цукровай ідыліі". Хэпі-энд — абсалютны і безумоўны: нават нячысцікі вокамгненна выправіліся ды скіраваліся разам з усім паспалітым людам ласавацца цукеркамі. Прычым арганізатары фэсту здолелі захаваць такую ідылічную, творчую і надзвычай камфортную атмасферу казкі праз усе восем з гакам гадзін свята.

Турівэнт у фармаце сацыяльна адказнага бізнесу

Цукеркавая "фішка" Івянца

Дух даўніны не выветрываецца...

Пра многія цікавыя святы ў рэгіёнах даведваешся выпадкова (а часам ужо і постфактум), ды і трапіць на іх можна хіба сваім ходам. "Цукеркавы фэст" — зусім іншая справа. Яго афішы з'явіліся не толькі ў Івянцы, але і ў Мінску, дзе жыве абсалютная большасць патэнцыйнай аўдыторыі. А ў пярэдадзень імпрэзы раскручваць і "прадаваць" фэст узяліся і турагенцтвы: яны актыўна фарміравалі групы спецыяльна "пад івэнт". Таму трапіць у Івянец здолелі не толькі шчаслівыя ўласнікі транспартных сродкаў.

— Няўжо турагенцтвы самі праявілі ініцыятыву? — пацікавіўся я ў галоўнага арганізатара фэсту Антаніны Хатэнка, якая на той самай фабрыцы займае пасаду спецыяліста па этнаграфіі (!). А ў адказ пачуў: ды не, гэта мы іх падахвоцілі. А цяпер вось, маўляў, нават і трошкі шкадуем. Бо некаторыя з "арганізаваных" турыстаў прагнулі выключна дармовай дэгустацыі цукерак, а сам фэст ім быў нецікавы…

Я і сам пакрыўдзіўся б на месцы арганізатараў. Бо яны здолелі стварыць комплексную сінкрэтычную дзею, дзе салодкі смак ідэальна дапасоўваўся да водару беларускай даўніны. Зрэшты, усё — па парадку...

Яшчэ да пачатку імпрэзы было зразумела, што празмерныя аматары салодкага — гэта прыкрыя выключэнні. За пару гадзін фотаздымкаў на фоне галоўнай адметнасці Івянца — не так даўно адрэстаўраванага касцёла Міхаіла Архангела, які дэманструе веліч "спелага барока", — было зроблена ці не больш, чым за папярэднія пару месяцаў. Турівэнт апраўдваў сябе!

Старых будынкаў у Івянцы засталося зусім няшмат, але местачковы ландшафт і планіровачная структура, на шчасце, збераглися. Карнавалізаванае шэсце арганічна ўлілося ў гэтыя берагі пакручастых вузкіх вулачак ды рушыла па іх да колішняй сядзібы Драгунцавых.

"Легкаважны", здавалася б, фэст утрымліваў адказ і на яшчэ адно вельмі сур'ёзнае пытанне: як вярнуць жыццё ў старыя шляхецкія фальваркі з дапамогай "падручных сродкаў" і без глабальных капіталаўкладанняў? Маёнтак Драгунцавых, зрэшты, і ў звыклы дзень не пустуе: тыя будынкі сядзібы, якія прыдатныя для выкарыстання, узяў пад сваю апеку івянецкі Музей традыцыйнай культуры. Уласна, гэтая ўстанова выступіла партнёрам "Цукеркавага фэсту". Пад час яго літаральна кожны метр карыснай плошчы былой сядзібы быў належна асвоены!

Так, маёнтак гэты сёння выглядае не лепшым чынам. Але "Цукеркавы фэст" засведчыў: нават тыя сядзібы, чый фізічны стан далёкі ад ідэальнага, могуць стаць выдатным месцам для правядзення культурных імпрэз: тут і прасторна, і, адначасова, утульна. Даволі непрыглядныя ў звычайны дзень руіны палаца ў чароўнай атмасферы свята набываюць рамантычны арэол. Бо дух даўніны не выветрываецца, ён нават больш трывалы за каменныя сцены.

Як адзначыла Антаніна Хатэнка, кожны фэст, які праходзіць на тэрыторыі гэтага помніка спадчыны, спрыяе не толькі яго папулярызацыі, але і "нарошчванню" патрэбнай інфраструктуры. Летась "нарасцілася" новая агароджа, сёлета — стацыянарная прыгожая сцэна, якая праслужыць яшчэ не адзін год. А прысядзібная каплічка, яшчэ летась зусім занядбаная, сёння цешыць вока і ўдзень, і нават уначы — дзякуючы шыкоўнай падсветцы. Гэта маленькі, але вельмі прыкметны плён высілкаў трох суб'ектаў: мясцовых улад, каталіцкай парафіі і фундатараў фэсту.

Унутры стыхіі свята

Размаітая праграма фэсту не проста ўтрымлівала элементы інтэрактыву — па сутнасці, яна была з іх саткана. Выступленні этнакалектываў неяк самі сабою ператвараліся ва ўсеагульныя карагоды, а апрача галоўнай пляцоўкі дзейнічаў яшчэ добры дзясятак лакальных, дзе прапаноўваліся розныя гульні ды забаўкі на любы густ.

— Мы прагнулі, каб наведвальнікі знаходзіліся не "звонку" падзеі, але непасрэдна ў эпіцэнтры той стыхіі, якой і з'яўляецца фэст, каб яны адчулі сябе паўнапраўнымі героямі свята, — кажа Антаніна Хатэнка. — Так, пераадолець мяжу паміж пасіўным сузіраннем ды актыўным удзелам сучаснаму чалавеку няпроста. Але апошняе свята засведчыла, што прагрэс тут — навідавоку…

"Цукеркавы фэст" — імпрэза забаўляльная ўжо апрыёры. У яе канву ніяк не ўпляцеш ні пафасныя лозунгі, ні шэкспіраўскія жарсці. Але забаўляць таксама можна па-рознаму. Вось і арганізатары фэсту вынайшлі свой, арыгінальны, фармат. Хаця новае — гэта, як вядома…

— У дзяцінстве я яшчэ заспела тыя фэсты, якія спантанна і выключна па народнай ініцыятыве ладзіліся ў нашых мястэчках, — згадвае Антаніна Хатэнка. — Мне яны і пагэтуль сняцца… Таму я прагнула аднавіць тую натуральную і вельмі добразычлівую атмасферу, што была ім уласціва...

Замест "інтэрнацыянальных" герояў многіх цяперашніх святаў (накшталт Шрэка або Чабурашкі) гасцей Івянца віталі тыя постаці, якія і сапраўды некалі жылі ў тых мясцінах і зрабілі важны ўнёсак у гісторыю мястэчка: князь Вітаўт, браты Тышкевічы, Пётр Драгунцаў… І паколькі экскурс у гісторыю адбываўся ў ненавязліва-гульнёвай форме, адсутнасць дзяжурнай Чабурашкі ніхто і не заўважыў.

Стылістычны фармат фэсту можна ўмоўна акрэсліць двума словамі: "этна" і "рэтра". І ён быў вытрыманы на ўсе сто працэнтаў, без "дысанансных акордаў". Тычылася гэта не толькі канцэртнай праграмы, але і кірмашовага складніка свята. "Касмапалітычныя" шашлыкі і пластмасавыя цацкі знайшлі сабе пачэснае месца па-за тэрыторыяй сядзібы, а вось у самім маёнтку прадаваліся адно "тэматычныя" тавары: вырабы майстроў, антыкварыят, фолькавыя дыскі... Быў там і свой пункт харчавання, спалучаны з майстар-класам па беларускай народнай кухні. Выпечаныя ў навучальных мэтах блінцы тут жа ішлі на спажытак. А непадалёк можна было ўбачыць каваля з молатам, ткачыху за кроснамі… І яны таксама ахвотна праводзілі імправізаваныя майстар-класы для ўсіх ахвотных.

Як выявілася, "эксклюзіўны шопінг" можа стаць адным са стымулаў наведвання такіх фэстаў. Калега з Мінска, якая трапіла на падобную імпрэзу ўпершыню, шчыра здзівілася: за невялікія грошы тут можна набыць арыгінальную рэч ручной работы.

Даследаванні і засваенне народнай культуры спарадзілі багата цікавых праектаў, якія маюць належны гістарычны базіс. Прычым тычацца яны не толькі песень, танцаў і рамёстваў, але таксама і кулінарыі, моды ды ўсіх іншых сфер жыцця чалавека. Такія імпрэзы, як "Цукеркавы фэст", сведчаць, што гэтыя набыткі можна пакласці ў аснову шыкоўнага шоу, якое ацэняць і "гурманы", і "неафіты".

Майстэрня ўражанняў

Аматарская творчасць — гэта асаблівы культурны феномен. Прыемна бачыць на сцэне не якуюсьці "залётную" поп-зорку, а свайго суседа Валодзьку. І калі ён трохі сфальшывіць, ты яму, натуральна, даруеш. Зусім іншая справа — калі імпрэза разлічана на людзей, якія прыехалі з іншых гарадоў або нават краін. Яны Валодзьку не ведаюць, і таму наўрад ці пабягуць займаць месцы.

Уласна, гэта мы да таго, што турівэнт не варта блытаць з канцэртам аматарскай творчасці (як часам у нас здараецца). Мэтавыя групы такіх імпрэз надта розныя. І вельмі лёгка здагадацца, якая з іх больш патрабавальная. Ці, дакладней, яны абедзве патрабавальныя, але... кожная — па-свойму.

Этнакультуролаг Антаніна Хатэнка можа падрабязна вытлумачыць кожны з незлічоных складнікаў свята. Выпадковых сярод іх не знойдзеш. І сапраўды, нават рэгей у выкананні гурта "Рэха", які прагучаў ужо напрыканцы праграмы, не выклікаў пачуцця няўтульнага дысанансу. Разам з такім модным сёння пунктам, як фаер-шоу, яны выявілі дынаміку развіцця самой з'явы пад назвай "народны фэст".

Але сапраўдным "апірышчам" свята была зладжаная каманда маладых людзей: рыцары, русалкі, нячысцікі... І кожны з ладнага спіса персанажаў выглядаў цалкам арганічна. Менавіта яны выцягвалі публіку на танец альбо паядынак, альбо распачыналі ўсё новыя і новыя гульні, не ведаючы ні спакою ні стомы. Гэтая крэатыўная каманда складаецца пераважна са студэнтаў і нядаўніх выпускнікоў Белдзяржакадэміі мастацтваў, аб'яднаных у творчую суполку "Майстэрня ўражанняў".

— Рыхтаваць сёлетні фэст мы пачалі яшчэ ў красавіку, дбайна прааналізаваўшы досвед папярэдняга, — распавядае Антаніна Хатэнка. — І маладыя акцёры настолькі ўвайшлі ў вобразы сваіх герояў — Князя Вітаўта або Братоў Тышкевічаў, — што маглі дазволіць сабе не выконваць ролі, а літаральна жыць імі…

Паводле яе слоў, у "Цукеркавым фэсце" маладых акцёраў вабіць перадусім магчымасць самарэалізацыі, а зусім не ганарары. Уласна, гэта характэрна для ўсіх яго ўдзельнікаў. А іх у Івянцы ўдалося сабраць нямала — нават нягледзячы на высокую планку, якую ўсталявалі арганізатары. Правальных месцаў у васьмігадзіннай праграме я не заўважыў.

Што да згаданага ўжо "Валодзькі"... Сваім, івянецкім хлопцам месца на сцэне, безумоўна, знайшлося. Як распавяла Антаніна Хатэнка, на леташні фэст тутэйшы рок-гурт не трапіў, бо не прайшоў аб'ектыўны адбор. Але за год маладыя музыкі падвучыліся граць і засвоілі беларускую мову. Іхні дэбют на "вялікай сцэне" сталічная публіка ўпадабала.

■■■

Урэшце, ад многіх іншых культурных імпрэз "Цукеркавы фэст" адрозніваецца і тое, што зладжаны ён быў выключна за спонсарскія сродкі. У той самы час, называць яго рэкламнай акцыяй ніяк не выпадае. Па ўсім, фундатар кіраваўся добрым прынцыпам "бензін" — наш, ідэі — вашы", цалкам давяраючы прафесіяналам. Таму зацягнутых "рэкламных паўзаў" сцэнарый не прадугледжваў.

Арэал бізнес-інтарэсаў кандытарскай фабрыкі, якая забяспечыла фэст "бензінам", зусім не абмяжоўваецца адным толькі Івянцом: большасць прадукцыі яна наогул адгружае на экспарт. Таму тлумачыць такую шчодрасць чыста меркантыльнымі інтарэсамі ніяк не выпадае. Адпаведна, прадпрыемства ўкладае грошы не толькі і не столькі ва ўласную рэкламу, колькі ў раскрутку сваёй "малой радзімы" — самога мястэчка Івянец. Па сутнасці, гэта і з'яўляецца ўзорам сацыяльна адказнага бізнесу. І — хочацца верыць! — узорам для пераймання.

— Наша галоўная мэта — абудзіць той творчы дух, што, неаспрэчна, захаваўся ў такім адметным мястэчку, як Івянец, — кажа Антаніна Хатэнка, — як бы "прыўзняць" яго і ў вачах гасцей, і ў свядомасці саміх жыхароў…

Івянец мае папраўдзе цікавую мінуўшчыну — як, зрэшты, і кожнае наша гістарычнае мястэчка. Справа толькі за тым, каб "праявіць" яе ў даступнай і прывабнай для шырокай публікі форме, знайсці тую брэндаўтваральную "фішку", пра якую ў адзін голас кажуць спецыялісты ў сферы турызму. Хай сабе гэта будзе сырны фэст, альбо яйкавы, альбо памідоравы… Прыклаўшы розум ды густ, у кожным гарадку можна стварыць тыя турівэнты, на якія мінчане будуць не толькі ахвотна ездзіць цэлымі сем'ямі, але і з гонарам запрашаць сваіх замежных гасцей, каб тыя маглі лепей спазнаць нашу краіну.

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Івянец — Мінск
Фота аўтара

Новы этап развіцця сяла:
сацыякультурны зрэз

Летась Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 514 ад 30.09.2010 была зацверджана Дзяржаўная праграма развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011 — 2015 гады — адзін з дзясяткаў стратэгічных дакументаў, рэалізацыя якіх вызначае эфектыўнае развіццё нашай незалежнай дзяржавы.

Праграма прадугледжвае стварэнне ў гэтай мясцовасці прыдатных умоў для адпачынку і пражывання людзей, забеспячэнне комплекснага выкарыстання прыродных рэсурсаў, павелічэнне экспарту паслуг, стварэнне перадумоў для актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці ды многае іншае. Таму цалкам заканамерна, што дзейнасць органаў улады Мядзельскага раёна, на тэрыторыі якога і плануецца ўвасабляць запланаванае і куды гэтым разам выправіўся ў камандзіроўку, накіравана на паспяховую рэалізацыю згаданага дакумента. Не застаецца ўбаку ад выканання задач Дзяржпраграмы, натуральна, і мясцовы аддзел культуры. Так, Мядзельскі музей народнай славы цяпер распрацоўвае новыя турыстычныя маршруты па тэрыторыі рэгіёна, у шматлікіх сельскіх дамах культуры і бібліятэках супрацоўнікі шчыруюць над тым, каб зацікавіць сваёй дзейнасцю патэнцыйнага турыста і, натуральна, займець з аказання шэрагу турыстычных паслуг пэўны прыбытак.

Ёсць пакуль што на гэтым шляху і свае "падводныя камяні". Прынамсі, пакуль не стае адладжанай рэкламы тых аб'ектаў, што могуць прывабіць кліентаў, марудна прасоўваецца справа са стварэннем пунктаў продажу сувенірнай прадукцыі, а культработнікі Мядзельшчыны толькі пачынаюць працаваць з уласнікамі шматлікіх аграсядзіб, што маюцца на тэрыторыі Нарачанскага краю. Але, як запэўнівае кіраўніцтва мясцовага аддзела культуры, у хуткім часе ўсе названыя праблемныя пытанні будуць вырашаны.

"Кручок" для інвестара:

Дзяржаўна-прыватная ініцыятыва ў турыстычнай вёсцы і без замкаў з пяску

Занарацкі СДК гатовы да абслугоўвання турыстаў.

Выкананне плана платных паслуг сферы культуры раёна, чынны ўдзел культработнікаў у развіцці турыстычнай сферы, эканамічная мэтазгоднасць шматлікіх праектаў, дзяржаўна-прыватнае партнёрства… Усе гэтыя тэмы былі агучаны на традыцыйнай райвыканкамаўскай "лятучцы", ініцыяванай "К". У ёй прынялі ўдзел намеснік старшыні Мядзельскага раённага выканаўчага камітэта па эканоміцы Леанід БЕРНЯКОВІЧ і начальнік мясцовага аддзела культуры Ганна ПАДГОЛ.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Распачну нашу гаворку, Леанід Сцяпанавіч, натуральна, з Дзяржпраграмы развіцця курортнай зоны Нарачанскага рэгіёна на 2011 — 2015 гады… Што ўдалося зрабіць з пачатку дзеяння дакумента? Якія далейшыя планы і перспектывы?

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Адразу зазначу, што дзякуючы гэтай Дзяржпраграме ўжо значна палепшылася сацыяльна-эканамічная сфера Мядзельшчыны, і далейшыя перспектывы таксама досыць добрыя. Вось толькі некалькі фактаў. На сённяшні дзень цалкам скончана рэканструкцыя Мядзельскага аўтавакзала, завяршаецца будаўніцтва гарадскога фізкультурна-аздараўленчага комплексу. У курортным пасёлку Нарач хутка завершыцца першая чарга рэканструкцыі мясцовай гасцініцы. Фінішуем з работамі па другім корпусе санаторыя "Прыазёрны", у санаторыі "Спадарожнік" будуецца другі спальны корпус на 136 месцаў са SPA-цэнтрам, кінаканцэртнай залай і рэстаранам... Словам, дадатных прыкладаў шмат, і гэты спіс можна доўжыць…

Ганна ПАДГОЛ:

— Калі ж казаць пра сферу культуры, дык, паводле Дзяржпраграмы, у нас запланаваны рамонт Цэнтра рамёстваў у вёсцы Крывічы. На гэтыя мэты цягам пяці гадоў прадугледжана выдаткаваць 750 мільёнаў рублёў. Сёлета з запланаваных 140 мільёнаў прыкладна палова сумы пайшла на рамонт даху ўстановы культуры, яшчэ блізу 30 мільёнаў будзе каштаваць замена вокнаў, а на астатнія грошы закупім у Цэнтр рамёстваў спецыяльнае абсталяванне і станкі для дрэваапрацоўкі. Да таго ж, нам трэба да 2015 года стварыць шэсць дадатковых турыстычных маршрутаў, адзін з іх — "Архітэктурныя помнікі Мядзельшчыны" — цяпер распрацоўваецца супрацоўнікамі раённага краязнаўчага музея. Гэты маршрут пачне функцыянаваць ужо сёлета…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Планы ў нас такія: па завяршэнні Дзяржпраграмы на Мядзельшчыне павялічыцца колькасць аб'ектаў для прыёму гасцей, турыстаў. Да прыкладу, цяпер будуецца турыстычная вёска ў паселішчы Наносы. Да кастрычніка — лістапада бягучага года там будуць створаны шэраг аб'ектаў: з дзясятак стылізаваных драўляных дамкоў. Яшчэ ў турыстычнай вёсцы будуць функцыянаваць млын, пякарня, рамесніцкія крамы, а таксама арганізуем продаж сувеніраў. Натуральна, у гэтай турыстычнай вёсцы абавязкова будуць дзейнічаць і культработнікі.

Ганна ПАДГОЛ:

— Так, бо яшчэ адна задача, пастаўленая нам Дзяржпраграмай, — правядзенне культурна-масавых мерапрыемстваў. Пад гэтыя мэты нам выдаткавана на пяць гадоў 250 мільёнаў рублёў. Сёлета, напрыканцы ліпеня, у нас пройдзе "Свята рыбы". Цягам яго плануем зладзіць спаборніцтвы для рыбакоў, конкурсы на лепшую "рыбную" песню, на лепшы замак з пяску, арганізуем, натуральна, продаж рыбы. Запланаваны ўдзел байкераў на водных матацыклах, фаер-шоу на вадзе, натуральна, выступленне нашых самадзейных калектываў ды многае іншае. І гэткія масавыя мерапрыемствы будуць праходзіць штогод, прычым іх тэматыка будзе пастаянна розніцца.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— А ці плануецца рамонт ці рэканструкцыя гарадскога Дома культуры? Будынак — досыць стары, ды і зала там усяго толькі на 200 месцаў… Выгляд яго не надта пасуе іміджу горада…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— У Дзяржпраграме прапісана, што Мядзелю неабходны новы гарадскі Дом культуры. Але на сёння гэтае пытанне з рэканструкцыяй толькі прапрацоўваецца — нічога канкрэтнага пакуль сказаць нельга.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Цяпер актыўна ставіцца пытанне аб прыцягненні інвестыцый у сферу турызму, гісторыка-культурнай спадчыны… Ці ёсць на Мядзельшчыне прыклады паспяховага дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва, ці ўкладаюць свае фінансавыя сродкі ў развіццё той жа сферы турызму прыватнікі?

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Так. Яшчэ летась да нас звярнулася прыватная фірма з Масквы з просьбай выдаткаваць ёй участак пад будаўніцтва аздараўленчага комплексу на базе старадаўняй сядзібы ў вёсцы Альшэва. Гэтая сядзіба — помнік архітэктуры XVIII стагоддзя — на сённяшні дзень ужо перададзена на баланс названай фірмы. Усе пытанні, звязаныя з перадачай аб'екта, былі вырашаны ў Міністэрстве культуры Беларусі, і расіяне атрымалі дазвол на аднаўленне сядзібнага дома. Ужо распачаты праектныя работы. Паводле папярэдніх разлікаў, на аднаўленне інвестарамі будзе выдаткавана шэсць — сем мільёнаў долараў ЗША. Яшчэ прыклад. Прыватнай фірмай у курортным пасёлку Нарач распрацоўваецца праект будаўніцтва выставачнага павільёна — накшталт мастацкай галерэі, — дзе будуць дэманстравацца карціны як выхадцаў з Мядзельшчыны, так і з іншых рэгіёнаў Беларусі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Думаю, не памылюся, калі скажу, што пытанне пра інвестыцыі, інвестараў, пра дзяржаўна-прыватнае супрацоўніцтва для вашага рэгіёна вельмі актуальнае і надзённае...

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Безумоўна. Асабліва калі казаць пра помнікі гісторыка-культурнай спадчыны. Бо не заўсёды ёсць магчымасць выдаткаваць значныя фінансавыя сродкі на іх аднаўленне, і прыход у дадзеную сферу прыватнага бізнесу — цалкам заканамерны крок. І гэтага не варта баяцца. Бо зразумела, што адноўленыя помнікі культуры прыватнік не забярэ, так бы мовіць, сабе ў кішэню. Яны застануцца на тэрыторыі нашага раёна і будуць служыць людзям: як жыхарам Мядзельшчыны, так і тым шматлікім турыстам, што будуць сюды прыязджаць.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Пад час паездкі па раёне бачыў, як шмат дзе вядуцца рамонтныя работы на дарогах. І сапраўды, без добрага асфальтавага пакрыцця не выпадае казаць пра прывабнасць для турыстаў тых або іншых рэгіёнаў… А вось што з раз-

Амфітэатр на беразе возера Мястра чакае гасцей на турівэнты.

Народ пытаецца і прапануе

Адных плакатаў — замала…

Пра перспектыўнасць і значнасць згаданай Дзяржпраграмы для развіцця Нарачанскага рэгіёна казалі ўсе, з кім давялося сустракацца і гутарыць цягам камандзіроўкі. Але, на погляд жыхароў Мядзельшчыны, для таго, каб завабіць сюды турыстаў, трэба зрабіць яшчэ даволі многа…

Сяргей Васільевіч, настаўнік, г. Мядзель:

— Я думаю, што трэба нашмат больш актыўна рэкламаваць наш рэгіён як у Беларусі, так і за яе межамі. Аднымі плакатамі на ўездзе ў райцэнтр тут не абмяжуешся. Трэба, каб рэклама пра нашы санаторыі, прыродныя багацці, архітэктурныя помнікі пастаянна гучала на тэлебачанні, радыё, была даступнай у Інтэрнэце… Ды і турыстычная інфраструктура ў нашым раёне пакуль што развіта, на мой погляд, недастаткова…

Ларыса Мікалаеўна, служачая, г. Мядзель:

— Будынак гарадскога Дома культуры ў Мядзелі досыць стары. Ды і глядзельная зала там маленькая: прыкладна на 200 месцаў. Ці плануецца рамонт дадзенай установы? Гэта, натуральна, станоўча спрацуе і на пазітыўны імідж горада ва ўяўленні тых замежных ды айчынных гасцей, што прыязджаюць сюды адпачыць…

Святлана Чарняўская, дырэктар Мядзельскага музея народнай славы:

— Лічу, неабходна абнавіць экспазіцыю нашай установы. На жаль, няма пакуль на гэта сродкаў. Не стае найноўшага камп'ютарнага абсталявання, мультымедыйнай устаноўкі… Словам, крыху ад часу адстаём…

Наталля Карэцкая, дырэктар Дзягіліўскага СДК:

— Няма дзе ў раёне прадаваць сувенірную прадукцыю. Таму адпаведны салон-крама ў Мядзелі быў бы вельмі дарэчы…

Дэталь да агульнай карціны

"Музычны" музей і медыятэка

Занарацкая сельская бібліятэка, як і іншыя бібліятэчныя ўстановы Мядзельшчыны, досыць няблага падрыхтавана да аказання самых розных турыстычных паслуг.

Акрамя самых запатрабаваных відаў паслуг — карыстання Інтэрнэтам, раздрукоўкі тэкстаў і ксеракапіравання, — у гэтай сельскай бібліятэцы кожны ахвотны можа азнаёміцца з базай даных "Лёс зямлі, лёс людзей", у якой сабраны матэрыял аб гісторыі паселішча, аб тых выдатных людзях, якія нарадзіліся на Мядзельшчыне. Маюцца ў бібліятэцы і шматлікія прэзентацыйныя ролікі, фотаздымкі навакольнай прыроды, медыятэка з 40 дыскаў. Пры ўстанове працуе Цэнтр прававой інфармацыі, а для ўсіх цікаўных зладжана выстаўка новай літаратуры.

Свае цікавосткі мае і Занарацкі сельскі дом культуры. Акрамя шматлікіх аматарскіх аб'яднанняў і гурткоў, якія працуюць у яго сценах, ва ўстанове нядаўна быў створаны Музей музычных інструментаў: тут можна ўбачыць старадаўнія баяны і акардэоны, цымбалы, бубны, свістулькі, ражкі і многае іншае… Начальнік аддзела культуры Мядзельскага райвыканкама Ганна Падгол упэўнена, што гэтая ўстанова будзе запатрабавана ў шматлікіх турыстаў, і з цягам часу ўваход у музей плануецца зрабіць платным.

На здымку: у Музеі музычных інструментаў.

віццём прыдарожнага сэрвісу? Ці будуць стварацца аб'екты адпаведнай інфраструктуры, а ў іх — пункты продажу сувенірнай прадукцыі, якую могуць вырабляць мядзельскія рамеснікі? На Вілейшчыне такі прыдарожны гандаль сувенірамі прыносіць неблагі прыбытак мясцовым аддзелам культуры…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Паводле Дзяржпраграмы, на рамонт дарожнага пакрыцця прадугледжаны немалыя сродкі. Сёлета асноўныя работы скіраваны па трасе на Маладзечна, бо, як вядома, у гэтым горадзе пройдуць рэспубліканскія "Дажынкі". А да 2015 года плануем зрабіць якаснае аднаўленне трасы, што ідзе праз Вілейку ў накірунку курортнага пасёлка Нарач. Што да прыдарожнага сэрвісу, дык сітуацыя тут пакуль што нас не вельмі задавальняе. Сваю справу адыгрывае, канешне ж, фактар сезоннасці: зразумела, што ў вясна-летні перыяд аб'екты прыдарожнага сэрвісу будуць карыстацца большым попытам, чым зімой, таму, адпаведна, павялічваюцца тэрміны акупнасці падобных аб'ектаў. Але мы спадзяёмся, што дзякуючы Дзяржпраграме прыдарожны сэрвіс выйдзе ў нас на якасна новы ўзровень, бо, як ужо казаў, цягам пяці гадоў у раёне плануецца пабудаваць шмат турыстычных гатэляў, і фактар сезоннасці, упэўнены, зменшыцца. На сайце райвыканкама падрыхтаваны прапановы для патэнцыйных інвестараў, якія захочуць укласці фінансавыя сродкі ў развіццё гэтага бізнесу.

Намеснік старшыні Мядзельскага райвыканкама па эканоміцы Леанід Берняковіч і начальнік мясцовага аддзела культуры Ганна Падгол.

спрацаваць з "уловам"

Райвыканкамаўская "лятучка" з "К"

Ганна ПАДГОЛ:

— Дадам, што да канца бягучага года плануецца арганізаваць кропкі па продажы сувенірнай прадукцыі мясцовых рамеснікаў у раённым музеі, у Цэнтры рамёстваў вёскі Крывічы, а таксама ў курортным пасёлку Нарач.

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Я цалкам падтрымліваю гэтую ідэю, бо на сённяшні дзень у раёне сапраўды праблематычна набыць сувеніры, выробленыя тутэйшымі майстрамі. Гэтая ніша пакуль не занята, а яе адназначна можна і патрэбна займаць аддзелу культуры. Бо я перакананы, што тыя, хто прыязджае ў нашы санаторыі (а працэнтаў 60 з іх — жыхары блізкага і далёка замежжа), заўсёды будуць зацікаўлены ў набыцці мясцовых сувеніраў, з нашай сімволікай, з надпісам на беларускай мове... Тая ж Рэспубліканская выстаўка-кірмаш "Камарова — кола дзён", якая ладзіцца ў нас штогод, кожным разам пацвярджае, што запатрабаванасць у такім тавары — найвялікшая. Словам, названая дзейнасць — адна з нашых бліжэйшых перспектыў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Наступная, на маю думку, нявыкарыстаная магчымасць — рэкламная дзейнасць. Не існуе свайго сайта ў аддзела культуры, у Цэнтральнай раённай бібліятэкі, няма рэкламы тых паслуг, якія могуць прапаноўваць шматлікія СДК і бібліятэкі раёна сваім наведвальнікам, тым жа ўладальнікам і гасцям аграэкасядзіб, хоць пэўная праца праводзіцца…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Згодны. З аднаго боку, на тэрыторыі раёна шмат вонкавай сацыяльнай рэкламы: "Люблю свой край", "Люблю Мядзельшчыну" і гэтак далей. А вось ля аграсядзіб рэкламных шчытоў амаль няма. Імкнёмся і гэтую нішу запоўніць. Да прыкладу, на пачатку года ў нас зарэгістравалася адна прыватная фірма, якая прапанавала зрабіць ролік аб Нарачанскім рэгіёне, аб тых санаторыях, якія тут маюцца, а таксама распрацаваць сайт па нашых санаторыях.

Ганна ПАДГОЛ:

— Што да інфармацыі пра турыстычныя маршруты, пра аграсядзібы, дык яна ёсць на сайце Мядзельскага райвыканкама. Таксама ў хуткім часе павінен з'явіцца і сайт Цэнтральнай раённай бібліятэкі: конкурс на лепшы праект падобнага сайта ўжо аб'яўлены.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Даволі слаба, падаецца, наладжана праца з гаспадарамі аграсядзіб. Наколькі я ведаю, аддзел культуры толькі распачынае работу ў гэтым кірунку…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Дзякуючы Дзяржпраграме колькасць аграсядзіб у нас павялічылася ў паўтара раза: летась было 32, а цяпер — 48. І, вядома, культработнікі не павінны застацца ўбаку ад прадастаўлення паслуг тым, хто прыязджае, каб адпачыць і палюбавацца хараством прыроды Мядзельшчыны.

Ганна ПАДГОЛ:

— Літаральна сёння ладзім выступленне нашых калектываў у адной з прыватных аграсядзіб: туды прыязджае дэлегацыя з Ізраіля — звыш 20 чалавек. А наступным днём яны паедуць на экскурсію, зладжаную супрацоўнікамі краязнаўчага музея.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— А ці ёсць на Мядзельшчыне такая арганізацыя, якая каардынуе дзейнасць паміж райвыканкамам і ўладальнікамі аграсядзіб? Напрыклад, на Вілейшчыне, у Расонскім раёне, падобная арганізацыя дзейнічае даўно і вельмі добра сябе зарэкамендавала…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Такога ў нас пакуль што няма, але, можа, і варта падумаць над стварэннем такой структуры.

Ганна ПАДГОЛ:

— Мы плануем сёлета правесці семінар з кіраўнікамі ўсіх аграсядзіб Мядзельшчыны: распавядзём пра тыя паслугі, якія можам аказваць у аграсядзібах, выслухаем пажаданні прыватнікаў аб супрацоўніцтве. І я думаю, што на гэтым семінары прапанова аб стварэнні арганізацыі, якая каардынавала б дзеянні паміж райвыканкамам і ўладальнікамі аграсядзіб, абавязкова прагучыць. Наколькі ведаю, многія гаспадары такіх аб'ектаў добра разумеюць усю важнасць стварэння падобнай сэрвіснай структуры на Мядзельшчыне. Да таго ж, гэта канкрэтная магчымасць узаемадзейнічання не толькі з райвыканкамаўскімі структурамі, але і між сабой. Вось, да прыкладу, сённяшняя група з Ізраіля будзе сяліцца на трох аграсядзібах. І заўсёды трэба ведаць, дзе ёсць вольныя месцы, дзе існуе магчымасць аказаць тую або іншую паслугу. Таму, я думаю, само жыццё прымусіць прадпрымальнікаў да стварэння такой структуры…

Леанід БЕРНЯКОВІЧ:

— Тут адна з найважнейшых сённяшніх дзялянак працы для аддзела культуры: фарміраванне творчай праграмы для прыезджых, магчыма — і з мясцовым каларытам, паказам традыцыйных абрадаў, правядзенне майстар-класаў, продаж сувеніраў… Трэба зацікаўліваць уладальнікаў аграсядзіб у такіх паслугах, бо гэта цалкам рэальна. Ды і самі прыватнікі, якія сур'ёзна ўзяліся за працу, упэўнены, будуць зацікаўлены ў супрацоўніцтве з аддзелам культуры, бо выдатна разумеюць, што гэтае ўзаемадзеянне карыснае для ўсіх... Трэба толькі не сядзець склаўшы рукі, а ісці да прыватнікаў са сваімі прапановамі ды праектамі. Тады такая дзейнасць прынясе свой плён і будзе працаваць на выкананне плана платных паслуг.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Мядзельскі раён — Мінск
Фота аўтара

Дэталь да агульнай карціны

"Саламяна-ваўняны" план

Як выканаць гадавы мільённы план платных паслуг, калі ў вёсцы пражывае каля 150 жыхароў, а з іх — толькі з дзясятак падлеткаў?

Адказ на гэтае пытанне ведае дырэктар сельскага Дома культуры вёскі Дзягілі Наталля Карэцкая.

— Не так даўно я асвоіла адзін з відаў народнага рамяства: саломакапляценне, — распавяла кіраўнік установы. — Гэта мне спадабалася. І цяпер без перабольшання магу сказаць, што вырабы з саломкі сталіся своеасаблівай візітоўкай нашай установы. Прадаём гэтыя сувеніры ўсім ахвотным, ездзім з імі на ўсе выстаўкі-кірмашы, што ладзяцца ў нашым раёне і за яго межамі. Летась зарабілі на продажы сваіх вырабаў блізу 500 тысяч рублёў, што складае палову плана платных паслуг…

Наталля Карэцкая прыахвоціла да заняткаў саломкапляценнем і сваю дачку, што працуе мастацкім кіраўніком СДК. А таксама асвоіла выраб сувеніраў з воўны. Дырэктар установы культуры ўпэўнена, што гэтая прадукцыя таксама будзе карыстацца вялікім попытам у пакупнікоў-турыстаў як з Беларусі, так і з іншых краін блізкага і далёкага замежжа.

На людным месцы

Дзяржыншчына: міжнародны пленэр

"R+Я" з Вялікага Сяла

Колькі гадоў запар на Дзяржыншчыне, у вёсцы Вялікае Сяло, ладзяцца Міжнародныя мастацкія пленэры пад назвай "R + Я". Сёлета чарговы, восьмы па ліку, сабраў прафесійных мастакоў з праблемамі слыху.

Як і ў мінулыя гады, іх гасцінна сустракала мастак-педагог, дырэктар Дзяржынскага раённага дома народнай творчасці, што месціцца ў Вялікім Сяле, Наталля Ермаловіч.

А хто ж яны, гэтыя мастакі? Гэта таленавітыя, са складаным лёсам, людзі, якім менавіта творчасць дапамагла знайсці месца ў жыцці. Іх пейзажы, выкананыя ў час пленэру, прасякнуты любоўю да прыроды.

Па выніках працы ў Дзяржынску была арганізавана выстаўка карцін, якая прыцягнула ўвагу многіх жыхароў раёнтра і раёна. Намеснік старшыні Беларускага таварыства інвалідаў па слыху Анатоль Нікіцін узнагародзіў удзельнікаў і арганізатараў пленэру граматамі.

З прывітаннем выступіў намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Чаган. Начальнік аддзела культуры Наталля Сінюковіч уручыла мастакам дыпломы. Яны ж, у сваю чаргу, падарылі асобныя са сваіх пейзажаў райвыканкаму і Вялікасельскай сярэдняй школе. Госці (збольшага — расіяне) наведалі Мірскі замак, старажытны парк у вёсцы Станькава, Музей народнай архітэктуры і побыту, пазнаёміліся са сталіцай. Гасцявалі яны і ў Дзяржынскай ДШМ, дзе іх прымаў мастак, педагог Уладзімір Шчарбін, нядаўна ўзнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Лявон ЦЕЛЕШ
Дзяржынск
На здымках: мастакі ля Дома народнай творчасці ў Вялікім Сяле.

Нараўляншчына: майстэрства ў этнаграфічным

Непаўторныя ручнікі

Хочацца распавесці пра вядомую майстрыху Валянціну Гаўрылавец.

Вышыўкай яна пачала займацца з адзінаццаці гадоў. І вышывае яна крыжыкам, гладдзю, займаецца вязаннем карункаў, сурвэтак, рукавічак і многіх іншых прадметаў хатняга побыту.

Работы Валянціны Максімаўны цяпер можна пабачыць у Нараўлянскім этнаграфічным музеі: ва ўстанове культуры з нядаўняга часу працуе персанальная выстаўка ручнікоў знакамітай майстрыхі. Усе гэтыя вырабы — непаўторныя, у кожны ўкладзена велізарная праца, і кожны прыцягвае вялікую ўвагу ўсіх наведвальнікаў выстаўкі.

Ірына ДУБЯНКОВА, галоўны захавальнік фондаў Нараўлянскага этнаграфічнага музея

Агонь — не жарты!

Бяспека жыцця

Летась у Беларусі адбыліся 1770 пажараў, якія зніштожылі 882 гектары лясоў.

Як вядома, спальванне смецця, лістоты, сухой травы паблізу ад пабудоў — нярэдкая прычына пажараў. Таму ў ППБ 2.13.-2002 "Правілы пажарнай бяспекі Рэспублікі Беларусь для жылых будынкаў, інтэрнатаў, індывідуальных гаражоў і садаводскіх таварыстваў" унесены змяненні, згодна з якімі, на тэрыторыі, прылеглай да названых пабудоў, не дапускаецца выпальванне сухой расліннасці, развядзенне вогнішчаў, спальванне смецця, прымяненне факелаў і іншых крыніц адкрытага агню. Прыгатаваць ежу можна толькі з дапамогай спецыяльных прыстасаванняў: мангала, барбекю, грыля і да т. п. (п.33 ППБ 2.13.-2002).

У адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжана адказнасць за парушэнне патрабаванняў правілаў пажарнай бяспекі ў лясах і на тарфяніках, выпальванне сухой расліннасці, распальванне вогнішчаў у забароненых месцах. Так, паводле артыкула 15.29, парушэнне патрабаванняў пажарнай бяспекі ў гэтых месцах або забароны на іх наведванне, што не нанесла шкоды, прадугледжвае папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да 25 базавых велічынь. Калі былі парушаны правілы пажарнай бяспекі ў лясах ці на тарфяніках, і гэта стала вынікам таго, што быў зніштожаны або пашкоджаны лес ці тарфянікі, прадугледжаны штраф у памеры ад 25 да 50 базавых велічынь. Паводле артыкула 15.57, незаконнае выпальванне сухой расліннасці, траў на карэнні, а таксама ржэўніку і пажніўных астаткаў на палях або непрыняцце мер па ліквідацыі пажару прадугледжвае накладанне штрафу ў памеры ад 10 да 40 базавых велічынь. Паводле артыкула 15.58, распальванне вогнішчаў у забароненых месцах прадугледжвае папярэджанне або накладанне штрафу ў памеры да 12 базавых велічынь.

Да таго ж, кожнаму чалавеку абавязкова трэба ведаць правілы паводзін пры пажары ў лесе. Пажар, што толькі пачаўся, можна патушыць сваімі сіламі. Для гэтага дастаткова пучка галінак ліставых дрэваў даўжынёй 1,5 — 2 метры. Наносьце ўдары па краі арэалу агню збоку ў накірунку ачагу пажару і збівайце асноўнае полымя. Пры кожным наступным удары пучок галінак затрымайце, прыціскаючы яго да краю, што гарыць, і адначасова яго вываварочвайце.

Калі ў вас ёсць лапата, дык уздоўж кромкі агню выкапайце ямкі або невялікія ровы, зямлю з якіх закідвайце ў ніжні бок полымя. Спачатку збіце агонь, затым, спыніўшы пажар, на кромку зноў насыпце зямлю суцэльнай паласой вышынёй 6 — 8 сантыметраў і шырынёй 0,5 метра. Распаўсюджванне лясного пажару можна спыніць, зграбаючы па шляху руху агню гаручыя матэрыялы. Шырыня ачышчанай паласы павінна быць не менш за 0,5 метра.

Калі побач з месцам загарання ёсць вадаём, то вада — найбольш эфектыўны сродак тушэння агню. Калі ўзгаранне не ўдаецца патушыць самастойна, то, не губляючы часу, тэлефануйце ў службу выратавання 101.

Таццяна БЫЧАНОК, спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага РАНС г. Мінска

І пасавая гарнітура

Адкрыцці за дваццацігоддзе

За апошнія два дзесяцігоддзі айчыннымі археолагамі пад час планавых і так званых выратавальных раскопак былі знойдзены дзясяткі тысяч артэфактаў — ад невялікіх кавалачкаў старадаўняй керамікі да ўнікальных узораў старажытнага мастацтва. У выніку плённай працы беларускіх гісторыкаў зніклі многія "белыя плямы" нашай мінуўшчыны. Больш за тое: знойдзеныя ў час археалагічных даследаванняў прадметы сталі тымі ключамі, што змаглі адкрыць новыя, раней практычна невядомыя старонкі айчыннай гісторыі. "К" вырашыла прыгадаць найбольш сенсацыйныя знаходкі і надзвычай важныя для спазнання нашай спадчыны навуковыя адкрыцці.

Шмат адкрыццяў прынеслі даследаванні грамадства першабытнага ладу і ў іншых рэгіёнах краіны. Толькі ў раёне будаўніцтва ГЭС — каля Гродна — адкрыта больш за 30 паселішчаў нашых старажытных продкаў каменнага, жалезнага вякоў і Сярэднявечча.

Не менш значнымі з'яўляюцца і раскопкі ў старадаўнім Полацку, якія ажыццяўляюцца далёка не першы год у межах адпаведнай дзяржаўнай праграмы. Не дзіва, што бадай кожны археалагічны сезон прыносіць новыя адкрыцці. Як падкрэсліў Марат Клімаў, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, у выніку за апошнія некалькі гадоў пад час раскопак былі знойдзены разнастайныя каштоўныя артэфакты, некаторыя — уперальны аб'ект — прыстань "узростам" у пяць стагоддзяў. У даследаваннях, якія праводзіліся пачынаючы з 1998 г., акрамя насыпу была знойдзена і дарога да прыстані, а таксама такія артэфакты культуры, як шахматная фігура ды бронзавыя кніжныя зашпількі.

Не менш цікавыя старонкі айчыннай гісторыі звязаны са знаходжаннем на нашай зямлі вікінгаў. За апошнія дзесяцігоддзі на Беларусі былі знойдзены сляды іх сталага пражывання, у тым ліку рэшткі старажытнага паселішча вікінгаў. У час раскопак выяўлены і элементы зброі і прадметы побыту, якія сведчаць пра тое, што знаходжанне вікінгаў на тэрыторыі Беларусі было не "транзітным", а пастаянным. Сярод самых значных знаходак — зліткі каляровых металаў, сярэбраны наканечнік ножан мяча, а таксама такі "сенсацыйны" артэфакт, як накладка на дружынны пояс вікінга X — пачатку XI стст., што была выяўлена пры правядзенні археалагічных даследаванняў Оршы на месцы, дзе праходзіў шлях "з варагаў у грэкі".

Зашпількі для кніг з Лучны.

Раскопкі на Мінскім замчышчы і адзін з артэфактаў, знойдзеных там.

Спрэчкі пра дату ўзнікнення вядуцца ў навуковых колах не толькі адносна Полацка, але і іншых старадаўніх беларускіх гарадоў, у першую чаргу — Мінска. Прыадкрыць заслону таямніцы зноў-такі спрабуюць археолагі. Як адзначыў загадчык аддзела сярэднявечнай археалогіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандр Мядзведзеў, штогод у цэнтры Мінска вядуцца раскопкі на плошчы прыкладна 500 квадратных метраў. Па словах Аляксандра Мядзведзева, з-за таго, што Мінскае замчышча мела найперш абарончае значэнне, знаходак выявілася не вельмі многа. Тым не менш, дзякуючы асобным артэфактам з'явілася меркаванне: непадалёк ад колішняга храма размяшчаўся палац князя, а таксама стайня, пра што сведчаць знаходкі рыштунку вершнікаў. Яшчэ адной незвычайнай і досыць нечаканай знаходкай стала "ноу-хау" XII ст., пра якое ўжо паведамляла "К": аналаг сучаснай каналізацыі — драўляная прылада, што збірала лішкі вады.

І калі пра старажытнае паходжанне Мінска ведаюць ці не ва ўсім свеце, то пра існаванне такога беларускага горада, як Казімір, што размяшчаўся каля Бярэзіны на дарозе паміж Бабруйскам і Рэчыцай, да 2001 года ніхто нават і не здагадваўся. У выніку аналізу архіўных матэрыялаў і археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Светлагорскага раёна доктарам гістарычных навук Сяргеем Рассадзіным з дапамогай мясцовых аматараў даўніны былі выяўлены рэшткі горада, які меў мясцовае самакіраванне, развітую прамысловасць і гандаль. На жаль, ён праіснаваў усяго некалькі дзесяцігоддзяў у XVII стагоддзі, але пры гэтым меў царкву, ратушу і іншыя, неабходныя для паўнавартаснага жыцця горада, будынкі.

Відавочна, такія значныя адкрыцці, як знаходкі старажытных паселішчаў і гарадоў, унікальных артэфактаў нашай старадаўняй культуры абавязкова паспрыяюць новым пошукам.

К.А.

Для большасці людзей такія археалагічныя культуры, як лінгбі, свідэрская, валкушанская, кудлаеўская, тшцінецкая, лужыцкая, пшэворская і вельбарская, лукірайкавецкая, пражская, практычна нічога не кажуць. У той жа час, яны адлюстроўваюць тысячы гадоў развіцця старажытнага грамадства на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Знайсці іх у адным месцы — вялікая рэдкасць і ўдача для археолага. А таму можна толькі ўявіць, якую радасць прынеслі раскопкі ў краі некранутай прыроды — Белавежскай пушчы. Як адзначыў загадчык аддзела археалогіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Вадзім Лакіза, пачынаючы з першых даследаванняў у 2007 годзе былі выяўлены артэфакты, што адлюстроўваюць перыяд засялення першымі людзьмі Белавежскай пушчы і яе навакольнай тэрыторыі ў эпоху позняга палеаліту, а таксама побыт першабытнага грамадства ў час мезаліту, неаліту, бронзавага веку, эпох жалеза і Сярэднявечча. Дзякуючы аналізу знойдзеных артэфактаў стала вядома, што рэкі, якія працякаюць праз Нацыянальны парк, у свой час сталіся воднымі шляхамі, дзе адбывалася пашырэнне размяшчэння індаеўрапейцаў.

Адзначаючы маштабнасць гэтых даследаванняў, варта згадаць, што толькі за першы год работ у Белавежскай пушчы было знойдзена некалькі тысяч артэфактаў, у тым ліку каменныя свідраваныя сякеры, фібулы і характэрныя для розных эпох наканечнікі стрэл. У выніку быў створаны адмысловы рэестр археалагічных помнікаў, што ўключае звыш 50 аб'ектаў і мае велізарны турыстычны патэнцыял.

Сярод знойдзенага археолагамі былі не толькі манеты ВКЛ, але і пражскія грошы.

шыню ў археалогіі краіны, у прыватнасці, пярсцёнак XII стагоддзя з выявай крыжа, крыж-энкалпіён, пасавыя гарнітуры, характэрныя для прыбалтыйскіх плямёнаў.

Але што самае важнае — артэфакты даюць каштоўную інфармацыю пра полацкіх князёў, якія кіравалі горадам да знакамітага Рагвалода, бо і да яго прыезду Полацк імкліва развіваўся, аб чым сведчаць знойдзеныя ў апошнія дзесяцігоддзі разнастайныя вырабы матэрыяльнай культуры і ўпрыгожанні.

Сталі сапраўдным навуковым адкрыццём і раскопкі ля вёскі Лучна, што пад Полацкам, дзе быў выяўлены ўніка-

Што на "Знаку ткацкай управы"?

Відавочна, што з цягам часу музейным прадметам патрабуецца якасная дапамога рэстаўратараў, якія вяртаюць творам мастацтва былую веліч. Не выключэнне — і збор Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, які з'яўляецца адным з найбуйнейшых у краіне і налічвае звыш 370 тысяч адзінак музейных прадметаў.

Дзякуючы падтрымцы спонсараў установы новае жыццё было дадзена двум цэхавым харугвам 1-й пал. XIX стагоддзя — вельмі рэдкім і ўнікальным артэфактам. Яны былі перададзены тагачаснаму Беларускаму дзяржаўнаму гісторыка-краязнаўчаму музею ў 1958 г. ад Белдзяржмузея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Да гэтага, у 1920 — 1930-я гг., харугвы знаходзіліся ў зборы Беларускага дзяржаўнага музея ў аддзеле мастацтва.

Харугвы нагадваюць пра перыяд самакіравання беларускіх гарадоў XVI — XVIII стст. — часы ўстанаўлення Магдэбургскага права. Як вядома, адным з вынікаў уводу сістэмы гарадскога самакіравання з'явілася стварэнне рамесных і гандлёвых цэхаў. Цэхавыя рамеснікі займаліся не толькі сваёй прафесійнай дзейнасцю, але і бралі ўдзел у грамадскім жыцці, неслі воінскую і іншыя павіннасці. Кожны цэх меў свае сімвалічныя атрыбуты, галоўнымі з якіх з'яўляліся пячатка і сцяг альбо харугва. З аднаго боку харугвы змяшчаліся выявы патронаў — святых заступнікаў цэха, а з другога давалася выява герба, калі такі быў абумоўлены статутам, або эмблема, што адлюстроўвала асноўныя віды прадукцыі ці характэрныя толькі для гэтага цэха інструменты і прылады. Так, на харугве цэхаў музыкаў змешчана выява цара Давіда з лірай у руцэ, а з другога боку — выява дзвюхгаловага арла; на харугве цэхаў ткачоў — абраз святога пакутніка Ануфрыя, а з другога боку — надпіс "Знак ткацкай управы".

Да гэтага часу з-за дрэннага стану захаванасці і наяўных пашкоджанняў экспанаванне харугваў без рэстаўрацыі было немагчымае. Цяпер жа іх можна будзе ўбачыць у рамках выставачнага праекта, які, як адзначылі ў музеі, мае адбыцца ў бліжэйшы час.

На здымках: харугва з выявай святога пакутніка Ануфрыя; так выглядаў цэх краўцоў (з сярэднявечнай гравюры).

Зорка і песня

Сёлета грамадскасць Гродзеншчыны святкуе 100-годдзе з дня нараджэння заслужанага дзеяча культуры БССР, кампазітара, ганаровага грамадзяніна Гродна Аляксандра Шыдлоўскага.

Днямі адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі на будынку Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, дзе Аляксандр Канстанцінавіч у свой час працаваў дырэктарам. Тут жа, па вуліцы Савецкай, 8, адбылася прэзентацыя сборніка песень кампазітара "Колькі ў небе зор…", куды ўвайшлі самыя знакамітыя творы аўтара.

Ушанаваць памяць Аляксандра Шыдлоўскага прыйшлі яго былыя родныя і блізкія, калегі і сябры, а таксама землякі са Смаргоншчыны. Удзельнікі ўрачыстасцей аднадушна адзначылі, што яго песні даўно сталі народнымі. А самая знакамітая — "Колькі ў небе зор…" — гімн не толькі каханню і пяшчоце, але, сёння ўжо, і жыццю аўтара, бо ён сам — адна з найяскравейшых зорак у культуры Гродзеншчыны.

У сваю чаргу, песні Шыдлоўскага прагучалі ў выкананні народных ансамбляў песні і танца "Нёман" Гродзенскага ГДК, "Ніва" Верцялішкаўскага ЦКіВЧ Гродзенскага раёна, народных ансамбляў песні "Гармонія" Гродзенскага АМЦНТ, "Багатуха" Глядавіцкага СДК Мастоўскага раёна, "Весялуха" Зэльвенскага РДК, народнага мужчынскага вакальнага ансамбля "Памяць" Путрышкаўскага ЦДК Гродзенскага раёна. Нельга не адзначыць, што заснавальнікам некаторых з іх быў сам кампазітар, а іншыя шануюць і пераймаюць лепшае ў творчасці майстра.

Вольга БАГДАНОВІЧ
Гродна
На здымку: ля дошкі А.Шыдлоўскаму.

Калектыў Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта глыбока смуткуе з прычыны смерці прафесара, доктара філалагічных навук, заснавальніка школы беларускай кінакрытыкі БОНДАРАВАЙ Ефрасінні Леанідаўны і выказвае шчырыя спачуванні яе блізкім і родным.

Журналісты рэдакцый газеты "Культура" і часопіса "Мастацтва" смуткуюць з прычыны смерці прафесара, доктара філалагічных навук, вядомага крытыка БОНДАРАВАЙ Ефрасінні Леанідаўны і выказваюць шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

6 ліпеня — Дзень нараджэння нашага вялікага земляка — Марка Шагала, імя якога мы сапраўды адкрылі для сябе менавіта за апошнія два дзесяцігоддзі — дзесяцігоддзі Незалежнасці Беларусі...

20 гадоў таму, на пачатку 1991-га, адбылося, можна сказаць, другое нараджэнне Марка Шагала ў нашай краіне, калі ў Віцебску ўпершыню былі арганізаваны Усесаюзныя Шагалаўскія дні з удзелам вядомых савецкіх дзеячаў культуры. Была праведзена і выстаўка, на якой экспанаваліся творы Шагала, рэдкія дакументы аб ягоным жыцці з прыватных збораў, а таксама, калі не памыляюся, з Пскоўскага архітэктурна-мастацкага музея і маскоўскага Музея выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна. Праз год у Віцебску была адкрыта першая экспазіцыя ў доме на вуліцы Пакроўскай, дзе жыла сям'я Шагалаў. У свой час я падарыў гэтаму музею з уласнага архіва невялічкі фрагмент рукапіснага ліста Ю.Пэна, дзе ён згадваў свайго вучня. Потым з'явіўся помнік майстру разца віцебскага скульптара Аляксандра Гвоздзікава, а таксама — мемарыяльная дошка. У 1997 годзе, там жа, у Віцебску, адкрыўся Арт-цэнтр Марка Шагала. Пачынаючы з 1997-га, у Беларусі праводзяцца рэгулярныя Міжнародныя Шагалаўскія пленэры, Шагалаўскія дні, Шагалаўскія чытанні, выстаўкі твораў мастака (пакуль, у асноўным, — графікі, гуашы і акварэлі) з прыватных і дзяржаўных калекцый.

"Тут мая душа. Тут і шукайце мяне..."

Валошкавы Віцебск Марка Шагала

Сёння ягонае імя ў нашай краіне "раскручана", як кажуць, "па поўнай праграме". Вось так бы "раскручваць" імёны іншых яркіх і таленавітых айчынных мастакоў або выхадцаў з Беларусі, якім з розных прычын давялося жыць, працаваць і здабываць славу ды гонар іншым дзяржавам...

Летам 1973-га Марк Шагал пасля пяцідзесяці гадоў прабывання ў эміграцыі разам з жонкай Валянцінай Бродскай па запрашэнні міністра культуры СССР Кацярыны Фурцавай здзейсніў тыднёвую паездку ў Маскву і Ленінград. У Маскве, у Траццякоўскай галерэі, адкрылася яго выстаўка графікі, і мастак падарыў Музею выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна 75 аўтарскіх літаграфій. У Ленінградзе сустрэўся з дзвюма сваімі сёстрамі, якіх ён не бачыў з пачатку 20-х гадоў.

За дзень да ад'езду ў Парыж, 20 чэрвеня 1973-га, ён сказаў у інтэрв'ю "Литературной газете": "Я хацеў бы перадаць сардэчнае прывітанне, маю любоў і самыя добрыя пажаданні Віцебску і маім зямлякам. Я вырашыў адмовіцца ад паездкі ў Віцебск толькі таму, што, як кажуць, моцнае эмацыйнае хваляванне небяспечнае для людзей майго ўзросту. Але ўсё роўна памятаю пра Віцебск і вельмі люблю яго: у мяне няма ніводнай карціны, на якой вы не ўбачыце фрагменты маёй Пакроўскай вуліцы. Гэта, можа, і недахоп, але зусім не з майго пункта гледжання..." І ў сваіх вершах: "Отечество моё — в моей душе./ Вы поняли?/ Вхожу в неё без визы..."

У Маскве Шагал сустрэўся з удавой свайго колішняга сябра, акцёра Саламона Міхаэлса — Анастасіяй Патоцкай, якая яго папрасіла: "Марк Захаравіч, калі вы паедзеце ў Віцебск, вазьміце мяне з сабою..." На што мастак адказаў: "Майго Віцебска ўжо даўно няма на зямлі. Яго цалкам зруйнаваў Гітлер. Па загадзе Гебельса мае карціны спальвалі ў Мангейме, знішчалі іх і ў іншых гарадах Германіі. Але, на шчасце, зніштожылі не ўсе творы. Мой Віцебск застаўся на маіх палотнах, у маім сэрцы..."

А вось што ён казаў маскоўскаму мастацтвазнаўцу Аляксандру Каменскаму: "Я бязмежна люблю свой родны Віцебск: не проста таму, што там нарадзіўся, але перадусім за тое, што там я на ўсё жыццё набыў колер свайго мастацтва... Я пасля доўгіх ваганняў адмовіўся ехаць у Віцебск, хаця ўзгадваю аб ім усё жыццё. Таму і адмовіўся, што ўзгадваю. Бо там, напэўна, я ўбачыў бы іншую абстаноўку, чым тая, якую памятаю, іншае жыццё. Гэта было б для мяне моцным узрушэннем. Як цяжка назаўсёды развітвацца са сваім мінулым!.."

Па вялікім рахунку, Шагал з гэтым сваім мінулым ніколі і не развітваўся. Гэтае мінулае, якое ўвабрала ў сябе біблейскія мудрасць і паданні, матывы "народнай яўрэйскай культуры, народнай беларускай культуры і рускага лубка" (Д.Ліхачоў), вобразы цырка і казкі, тэмы любові і творчасці, нараджэння і смерці, хараства і шчасця быцця, засталося ў ім да апошняга ў жыцці вечара 28 сакавіка 1985 года.

Ён пранёс сваё мінулае праз усю сваю доўгую біяграфію, увасобіў у сотнях палотнаў, гуашаў, акварэлей, эстампаў і малюнкаў уласны, ні на каго не падобны Космас пад назвай "Віцебск". І ў гэтым сэнсе яму ў свеце як патрыёту сваёй Бацькаўшчыны, якую ён назаўсёды страціў у 35-гадовым узросце, няма роўных. Шмат гадоў шагалазнаўцы вядуць дыскусіі: якому народу належыць творчасць мастака? Вось што на гэты конт казаў сам Марк Захаравіч: "Хаця мяне ва ўсім свеце лічаць і "інтэрнацыяналістам", і французы рады ўстаўляць мае творы ў свае аддзелы, я сябе вызначаю рускім мастаком, і мне гэта прыемна". Але іншым разам мог сказаць: "Я — французскі мастак". Або: "Я — вандроўны яўрэй". Аднак аб'ектыўна ўсе падобныя словы Шагала не трэба разглядаць так катэгарычна. Шагал мог і пакакетнічаць, і казаць сур'ёзна, ставячы ў тупік прафесіяналаў-мастацтвазнаўцаў сваімі складанымі размовамі пра ўласную творчасць. Можна сімвалічна лічыць, што па нацыянальнасці Шагал быў... віцябчанін. Сам мастак такі пасаж, мяркую, мог бы ацаніць па заслугах.

А калі сур'ёзна, дык, як бы там ні было, ён па праве сёння належыць французскаму мастацтву гэтак жа, як беларускаму, рускаму, яўрэйскаму. І, безумоўна, спрэчка, каму належыць Шагал — Расіі, Беларусі ці Францыі, — бессэнсоўная. Сапраўды, ён мастак інтэрнацыянальны ў поўным сэнсе гэтага слова. Але яго этнічная Радзіма — усё ж такі наша Беларусь, тая, што з прычыны гістарычных абставін у XIX ст. і пачатку XX-га ўваходзіла ў склад Расійскай імперыі. І трэба шчыра сказаць: без Віцебска, горада яго дзяцінства і маладосці, не было б таго ўнікальнага Шагала, якога сёння мае сусветная гісторыя выяўленчай культуры.

Не магу не прывесці думку пісьменніка Юрыя Нагібіна: "Нельга разумець Шагала, калі выключыць Віцебск з яго жыцця. Ні Пецярбург, дзе ён вучыўся жывапісу, ні Масква, дзе ён працаваў, ні Францыя, дзе ён пражыў пераважную частку жыцця, ні ўсе іншыя землі, што ён наведваў, не далі яму і малой долі тых абпальваючых душу ўражанняў, якімі ўзнагародзіў яго Віцебск".

А вось што пісаў Ілья Эрэнбург: "Здаецца, уся гісторыя сусветнага жывапісу не ведала мастака, настолькі прывязанага да свайго роднага горада, як Шагал. Жадаючы сказаць нешта добрае пра Парыж, Шагал называў яго "мой другі Віцебск". Я яго сустракаў некалькі разоў у Парыжы. Малады Шагал паўтараў: "У нас дома". Я яго пабачыў праз доўгі час у майстэрні на авеню Арлеан, і там ён маляваў хаткі Віцебска. У 1946 годзе мы сустрэліся ў Нью-Ёрку; ён пастарэў, гаварыў пра лёс Віцебска, аб тым, як яго цягне дадому..."

Але родны "дом" (да 1937 года, калі Шагал стаў паўнапраўным грамадзянінам Францыі, ён лічыўся грамадзянінам Расіі) яго ўжо даўно не ўзгадваў, да самай хрушчоўскай адлігі. А калі і ўзгадваў шырока прызнанага ў свеце мастака, дык вельмі арыгінальным чынам. Напрыклад, у першым выданні Вялікай савецкай энцыклапедыі пра Шагала сказана: "...Сучасны рускі жывапісец і графік, паходзіць з дробнабуржуазнага яўрэйскага асяроддзя г. Віцебска". У самога ж Шагала яго "буржуазнае паходжанне" выклікала поўнае неўразуменне: "Я ж выйшаў з беднага народу! Я вельмі добра памятаю мазалі майго таты і безнадзейнасць яго жыцця і працы". У кнізе "Маё жыццё" майстра ўдакладняе: бацька быў рассыльным у гандляра селядцом. У энцыклапедычных выданнях 70 — 80-х гадоў ён значыўся ўжо не рускім, а чыста французскім мастаком. Хаця ягонае мастацтва немагчыма ўявіць без Віцебска, дзе ён нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства, дзе засталіся магілы яго родных і блізкіх: "Тут — мая душа. Тут і шукайце мяне, вось я, мае карціны, мае вытокі..."

Але цягам доўгага часу і мы на яго забыліся. Ён быў для нас авангардыстам-"леваком" і перш за ўсё — эмігрантам. Вядома, што да эмігрантаў у савецкі перыяд ставіліся, мякка кажучы, вельмі насцярожана. А што да арыгіналаў Шагала, то яны былі даўно змешчаны ў сховішчах РСФСР і чакалі свайго лёсу разам са шматпакутнымі карцінамі Малевіча і Кандзінскага. У Беларусі ж іх зусім не было, нават літаграфскіх эстампаў. Ды і ў кнігах па беларускім мастацтве, калі і згадвалася імя Шагала, то толькі ў негатыўным сэнсе: як "фармаліста", "мадэрніста", які "паказваў жыццё яўрэйскага мястэчка ў хваравіта-суб'ектыўным і містычным праламленні".

І нічога дзіўнага не было ў тым, што нават 100-годдзе з дня нараджэння вялікага мастака на ягонай радзіме ніяк не адзначалася. Прычыны? Розныя. Вось, казалі, Шагал — антыкамуніст, бо аздабляў роспісамі сінагогі ў Іерусаліме; вось, памёр мільянерам, але ж так і не перадаў Віцебску аніводнай карціны. А хто б іх тады, у савецкія часы, прыняў? Унучка Шагала — Мерэт-Грабер Мейер, будучы ў Мінску, ужо ў незалежнай Беларусі, расказвала мне, што яшчэ ў 1972 годзе ейны дзед выказаў жаданне пабудаваць за ўласны кошт у Віцебску карцінную галерэю і перадаць туды свае работы, але, кажуць, "шэры кардынал" Міхаіл Суслаў, галоўны ідэолаг Палітбюро ЦК КПСС, асабіста забараніў гэтую акцыю.

Так гэта ці не — дакладна не ведаю, такіх дакументаў не бачыў. Але ведаю тое, што эстэтычныя, прафесійныя катэгорыі ў ацэнках уласна творчасці Шагала практычна не існавалі. Ды і цяпер рэдка хто з мастацтвазнаўцаў можа прафесійна аналітычна і па-сапраўднаму "пранікнуць" у сутнасць шагалаўскага духоўнага візуальна-віртуальнага "космасу" — без агульных прыгожых слоў-пацерак, без празмернага піетэту і іншых салодкіх да прыкрасці вохканняў. Але так бывае: з нябыту (для нас, сучаснікаў) — адразу на "раскрытую" вяршыню сусветнага мастацкага Алімпа! Тут можна і разгубіцца ў аб'ектыўных ацэнках. Хаця, па праўдзе кажучы, паняцце "аб'ектыўнасці" ў ацэнках мастацтва вельмі сумніўнае. Аналагічны шлях "забыцця", а потым касмічнага "ўзлёту" прайшлі ў свой час творы Рублёва, Босха, Эль Грэка, Ліотара, Хогарта... Што тут зробіш? Затое хтосьці з зямлян, смею спадзявацца, дзякуючы Шагалу даведаўся, што ёсць у цэнтры Еўропы такая таленавітая, цудоўная і жывапісная краіна пад назвай "Беларусь".

Тым не менш, пакуль у нас па-ранейшаму няма ніводнай жывапіснай карціны майстра, хаця, па вялікім рахунку, вельмі хацелася б, каб унучкі Шагала — Мерэт і Бэла, якія неаднойчы наведвалі Мінск і Віцебск, акрамя падоранай імі тыражнай графікі, зрабілі б сюрпрыз дзедаваму гораду ў выглядзе арыгінальнага жывапісу. Хаця тры карціны і каля 60 малюнкаў Шагала ўдава і дачка мастака падарылі ўвесну 1992 г. маскоўскаму Пушкінскаму музею...

(Працяг будзе.)

Барыс КРЭПАК

Марк Шагал. Пачатак 1900-х.

М.Шагал. "Вяселле". 1911 г.

М.Шагал. З віцебскіх замалёвак да кнігі "Маё жыццё".

АК Афіша "К"

з 2 ліпеня — да 9 ліпеня

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
- Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
- Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
- Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:
- Выстаўка аднаго шэдэўра. Іранскі тэбрызскі дыван.
- Выстаўка графікі **"И прелести твоей секрет разгадке жизни равносилен…"**. Да 18.07.2011.
- **"ТРОГАТельная выставка"**. Да 18.07.2011.
- Выстаўка **"Італія, радзіма натхнення"**. Да 04.09.2011.
- **"Класіка графікі"**.
- Прэзентацыя карціны Н.Лівянцовай **"1944"**.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.
- Пастаянная экспазіцыя.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.
- Выстаўка **"Таямніцы дрэва. Разьба па дрэве, чаканка"**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.
- Пастаянная экспазіцыя **"Культура І-й пал. XIX ст."**.
- Выстаўка работ навучэнцаў Магілёўскай ДШМ.

МУЗЕЙ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст."**.
- **"Старажытная Беларусь"**.
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
- **"З крыніц адвечнай прыгажосці"**.
- **"Водбліскі ваеннай славы"** (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).

Выстаўкі:
- **"Экспануецца ўпершыню"**.
- **"Ротмістр Вітольд Пілецкі. 1901 — 1948"**. Да 24.07.2011.

Дом-музей І З'езда РСДРП г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
- Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя І З'езда РСДРП"**.
- **"Казакі — абаронцы айчыны"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.
- Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўка:
- **"Дзе льецца Нёман срэбраводны…"**. Да 01.07.2011.
- **"З узбекам песню адной мовай складалі аб вайне…"**.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.
- Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы"**.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
- Музейная гульня **"У пошуках Папараць-кветкі"**.
- Выстаўка **"Свет там думкі хітрыя знае…"** *(рэклама ў перыядычным друку пач. XX ст. у артэфактах эпохі)*.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- Выстаўка шаржаў Аляксандра Каршакевіча.
- Выстаўка Святланы Дубялір **"Гульня фантазіі"**.
- **"Свет шчодры. Свет мяне паўторыць…"** (да 80-годдзя з дня нараджэння У.Караткевіча).
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"**.
- **"Спадарожнікі дзяцінства"**.
- Выстаўка карцін у тэхніцы прасаванай фларыстыкі (ашыбана) мастачкі Анжалікі Чудзіевіч **"Натхненне"**.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Пераможцы"**.
- **"Вітражы партызанскай мудрасці і кемлівасці"**.
- **"Дарогамі Перамогі. Бацька і сын Федарэнкі"**. Да 31.08.2011.
- Фотавыстаўка Ларысы Салодкінай **"Творцы Перамогі"**.
- **"Абаронцам Айчыны"**.

Экспазіцыі:
- **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня"**.
- **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокальны паверх паўднёвай галерэі).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы"**.

Выстаўкі:
- Выстаўка кніг **"Мастацтва для вечнасці"**.
- Выстаўка твораў Вольгі Капачовай **"Muchos bessos"**.

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
- **Пакой крывых люстэркаў.**
- **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.
- Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Бурштын — золата Балтыкі"**.
- Выстаўка **"Яркая палітра шасцідзясятых"**.
- **"Беларусь стваральная"**.
- Выстаўка В.Касаткіна **"Жывіца. Часавыя прасторы"**.
- Выстаўка Тацяны Шубінай **"Метал Скреп-Арт. Мастацтва металічнага лому"**.

Гомельскі парк

Прыватная калекцыя галубоў **"Сімвал міру і любові"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

Выставачная зала:
- Падрыхтоўка новай выстаўкі.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.
- Персанальная выстаўка Мікалая Несцярэўскага.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.
- Выстаўка дыпломных прац дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4, пр.Леніна, 43. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:
- **"Гаўрыла Вашчанка"**.
- Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:
- Выстаўка габеленаў Галіны Крываблоцкай. Да 03.07.2011.
- Выстаўка алавяных салдацікаў і мадэлей караблёў А.Ляўкова.
- Конкурс дзіцячай і юнацкай творчасці памяці Станіслава Дзьяканава. Да 03.07.2011.
- Выстаўка керамікі і жывапісу Тамары і Івана Курачыцкіх. З 07.07.2011.

НАГАДВАЕМ!
ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА ЖНІВЕНЬ І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ 2011 ГОДА!

Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

УВАГА!

Паспяшайцеся на пошту!


Пляцоўка каля стэлы "Мінск — горад-герой", па традыцыі, стане цэнтрам запамінальных урачыстасцей з нагоды Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь!
Фота Пятра ОВАДА

ТЭАТРЫ*

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл.: 334 60 08.
- **4 — "Адвечная песня"** Янкі Купалы.
- **5 — "Неба ў дыяментах"** А.Чэхава.
- **6 — "Чайка"** А.Чэхава.
- **7 — "Што баліць?"** Л.Агулянскага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.
- **4 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **5 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
- **6 — "Лятучая мыш"** І.Кальмана.
- **7 — "Шахразада"; "Іспанскія мініяцюры"**.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
- **9 — "Брэменскія музыкі"** В.Ліванава, Ю.Энціна.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Галоўны рэдактар — Людміла Аляксееўна КРУШЫНСКАЯ
Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.
Рэдакцыя: Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).
Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.
Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290-22-50 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — **Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"**
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 290-22-50. Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

© "Культура", 2011.

Індэкс 63875
Наклад 8365
Падпісана ў свет 30.06.2011 у 18.30
Замова 3119
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.
ISSN 1994-4780
9 771994 478007 11027